КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 41 (1637) | 20 кастрычніка 2023 г.

На што здольная татава любоў?

Калі твой бацька — легенда

Стар. 8—9

На калажы — Леў і Сяргей Гумілеўскія

KULTURA-INFO.BY

Крыніца вопыту, сілы і мудрасці. 21 кастрычніка — Дзень бацькі 2

Культурна-відовішчныя мерапрыемствы. Заканадаўства ў пытаннях і адказах 4

Беларусьфільм. Дыягназ — рэжысёр. Да 100-годдзя беларускага кіно 10

Фота: president.gov.by

Кожнай беларускай сям’і — міру і ўзаемаразумення

Такія пажаданні ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прагучалі ў Дзень маці. І шчырыя словы чырвонай ніткай прайшлі праз усе святочныя мерапрыемствы Тыдня бацькоўскай любові, які завяршаецца 21 кастрычніка, у Дзень бацькі.

Гэтае свята ў нашай краіне адзначаецца другі раз. Прапанова заснаваць Дзень бацькі прагучала падчас звароту Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 28 студзеня 2022-га. Кіраўнік дзяржавы ідэю адразу падтрымаў і даручыў Ураду распрацаваць адпаведны дакумент. Ужо 9 чэрвеня Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 198.

Дата святкавання Дня бацькі — 21 кастрычніка — невыпадковая: у нашай краіне склаўся шматтадовы звычай адзначаць Дзень маці, і з 14 па 21 кастрычніка з’явілася магчымасць ладзіць бацькоўскі тыдзень. Правядзенне ў гэты перыяд адпаведных мерапрыемстваў спрыяе захаванню традыцыйных сямейных каштоўнасцей, павышэнню важкасці дзяржаўнай сямейнай палітыкі.

— Дзень бацькі закліканы падкрэсліць асаблівую значнасць ролі мужчыны ў выхаванні дзяцей, стварэнні моцнай і шчаслівай сям’і, — канстатаваў Прэзідэнт у віншаванні з нагоды новага свята.

Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, падмуркам шматвяковага ўкладу жыцця беларускага народа заўсёды былі традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, у адпаведнасці з якімі бацька — кіраўнік і апора ўсяго роду, крыніца назапашанага ў пакаленнях вопыту, сілы і мудрасці продкаў. У сучасным свеце менавіта асабісты прыклад, клопат і падтрымка бацькі выхоўваюць у дзецях адказнасць, працавітасць, павагу да старэйшых, гатоўнасць служыць Радзіме і абараняць сваю зямлю.

— Перакананы, новае свята ўмацуе аўтарытэт бацькоўства ў грамадстве і нароўні з Днём маці стане адной з любімых сямейных урачыстасцей, — падкрэсліў летась беларускі Лідар.

І яго словы спраўджваюцца — сёння ва ўсіх кутках краіны праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя татам і матулям.

Звяртаючыся да суайчыннікаў у гэтыя святочныя дні, Прэзідэнт пажадаў усім моцнага здароўя і шчасця, а кожнай беларускай сям’і — міру і ўзаемаразумення. “Няхай любоў і ўдзячнасць дзяцей стануць найлепшай узнагародай”, — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

Перспектыўныя напрамкі

Беларусь і Экватарыяльная Гвінея маюць намер пашыраць узаемадзеянне ў сферы культуры.

У рамках першага пасяджэння Сумеснай пастаяннай камісіі па супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Экватарыяльная Гвінея 18 кастрычніка адбылася сустрэча намесніка міністра культуры Беларусі **Сяргея Саракача** і намесніка міністра культуры, турызму і развіцця рамёстваў Экватарыяльнай Гвінеі **Хероніма Нсуе Асуму Нчама**.

Падчас перагавораў былі абмеркаваны перспектыўныя напрамкі двухбаковага культурнага супрацоўніцтва, разгледжаны канкрэтныя праекты для магчымай рэалізацыі ў галіне музейнай справы, адукацыі ў сферы культуры, дасягнуты дамоўленасці аб абмене досведам і актывізацыі далейшага ўзаемадзеяння.

Як адзначыў міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь **Сяргей Алейнік**, першае ў гісторыі беларуска-экватагвінейскіх адносін пасяджэнне Сумеснай пастаяннай камісіі адбылося яшчэ да ўступлення ў сілу Рамачнага пагаднення аб супрацоўніцтве, якое закладае юрыдычны базіс для яе функцыянавання. Гэта выдатны старт.

Захоўваючы повязь з каранямі

У Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту 14 кастрычніка прайшла акцыя “Вішнёвы сад”, прымеркаваная да 70-годдзя Міністэрства культуры і да Дня маці. Супрацоўнікі ведамства паўдзельнічалі ў пасадцы 70 дрэў.

Як паведаміў намеснік дырэктара музея **Яўген Мікула**, галоўная задача ўстановы, што існуе ўжо больш за 45 гадоў, — захаванне помнікаў драўлянага дойлідства. Адным з напрамкаў дзейнасці з’яўляюцца таксама культурна-масавыя мерапрыемствы. Ладзяцца абрады і на Каляды, і на Масленіцу, і на Купалле, і на іншыя святы. Калі Міністэрству культуры споўнілася 70 гадоў, было вырашана стварыць вішнёвы сад на мяжы музейнай тэрыторыі.

У дзень Пакроваў Прасвятой Багародзіцы акцыя распачалася святочным касціміраваным шэсцем з традыцыйнымі спевамі пад акампанемент музычных інструментаў — скрыпкі ды дуды. Каля будучага сада таксама прадставілі невялікую выставу сельскагаспадарчых прылад, якія выкарыстоўваліся ў розныя часы ў беларускай вёсцы. Да шэсця і высадкі дрэў далучыліся навучэнцы Азярцоўскай сярэдняй школы.

З вітальным словам да ўдзельнікаў акцыі звярнуўся міністр культуры **Анатолій Маркевіч**: “Гэты дзень сабраў нас, каб мы выказалі шчырую падзяку матулям і блізкім людзям за тое, што яны заўсёды дапамагаюць і словам, і справай. Вельмі важна, што сёння мы сустрэліся ў цудоўным месцы — Беларускім музеі народнай архітэктуры і побыту, бо менавіта ў гэтым кутку захаваны традыцыі нашай вёскі і яе жыхароў. Добра, што тут прысутнічаюць юныя грамадзяне краіны, дзяўчаткі і хлапчукі, якія таксама дакрануліся да нашай вялікай гісторыі, бо іменна тая дзяржава, якая ведае сваю мінуўшчыну, мае права на існаванне”.

Уражаннямі падзялілася начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры **Ірына Карповіч**: “Сёння выдатны дзень, у які адзначаюцца такія цудоўныя святы, як Дзень маці і Пакровы Прасвятой Багародзіцы. Мы сабраліся ў Музеі народнай архітэктуры і побыту, каб закласці вішнёвы сад. Гэтая цудоўная традыцыя, безумоўна, зарадзілася ў даўнія часы, і мы хочам паказаць маладому пакаленню, што яе нельга забываць, бо ў горадзе ўжо знікаюць культурныя асаблівасці, характэрныя для вёсак. Мы прывыклі, што ўсё замяняе тэхніка, але ў гэтым выдатным месцы можна ўбачыць прылады працы, якія існавалі раней, жывёл, што жылі ў кожным двары, паўдзельнічаць у пасадцы дрэў, якая суправаджаецца традыцыйнымі абрадамі і песнямі, а яшчэ даведацца, як абыходзіцца з саджанцамі і на якую глыбіню іх садзіць. А калі расліны закрасуюць, будзе вельмі прыемна прыехаць і пакаштаваць вішні. Гэтая цудоўная традыцыя яшчэ мацней зблізае нашых людзей і выхоўвае ў новага пакалення любоў да народных абрадаў. Вельмі важна, каб маладосць і досвед ішлі побач”.

Напрыканцы ўдзельнікі акцыі ўсталявалі перад садам памятную шыльду, пачаставаліся ячнай са скваркамі і паглядзелі спектакль “Збянтэжаны Саўка”. У пастаноўцы паводле п’есы Леапольда Родзевіча іграла супрацоўнікі музея.

Марына Парахаўнічэнка на адкрытым уроку з Хорам хлопчыкаў і юнакоў імя І. А. Жураўленкі

Пётр Савінкаў падчас майстар-класа

Досвед, карысны для ўсіх

Педагогі Беларусі і Расіі правялі майстар-класы для юных музыкантаў у межах ініцыятывы “Міжнародная творчая школа”.

Праект рэалізаваны дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры нашай краіны ў Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Як паведаміла дырэктар установы **Наталля Кароціна**, ідэя арганізаваць падобны цыкл заняткаў узнікла ў мінулым навучальным годзе.

— Гімназія-каледж гістарычна была цэнтрам метадычнай дапамогі музычным школам Беларусі, — адзначыла Наталля Кароціна. — Для нас важна аднавіць гэтую дзейнасць, прыцягнуць да яе найлепшых спецыялістаў. Для любога музыканта вялікае значэнне маюць зносіны з прызнанымі майстрамі. Кампетэнтнае меркаванне і позірк з боку даюць творчасці новы імпульс.

Гэтым разам “Міжнародная творчая школа” працавала з 12 па 14 кастрычніка па кірунках “Спецыяльнае фартэпіяна” і “Харавое дырыжыраванне”. Навучэнцы і выкладчыкі гімназіі-каледжа і дзіцячых музычных школ мастацтваў з усёй рэспублікі атрымалі ўнікальную магчымасць павысіць творчы і прафесійны ўзровень, наведаць адкрытыя ўрокі, адмысловыя сустрэчы і майстар-класы, пачуць каштоўныя парады і рэкамендацыі ад музыкантаў — дасведчаных педагогаў.

Больш за 40 юнакоў і дзяўчат з усёй Беларусі прыехалі ў Мінск на майстар-класы піяністаў. Тры дні дацэнт кафедры спецыяльнага фартэпіяна Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага **Дзмітрый Людкоў** і загадчык кафедры спецыяльнага фартэпіяна Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, дацэнт **Уладзімір Дулаў** працавалі з навучэнцамі гімназіі-каледжа і дзіцячых музычных школ нашай краіны, шчодра дзяліліся з калегамі-педагогамі прафесійнымі сакрэтамі.

Узорным майстар-класам па мастацтве канцэртнага выканальніцтва стала сольнае выступленне Дзмітрыя Людкова. Ён бліскуча сыграў музыку Моцарта, Клементі, Шапэна, Скрабіна, Рахманінава.

Хормайстар, выкладчык Музычнага вучылішча імя Гнесіных, мастацкі кіраўнік і дырыжор Акадэмічнага і Камернага хароў гэтай установы **Пётр Савінкаў** правёў серыю майстар-класаў з Хорам хлопчыкаў і юнакоў імя І. А. Жураўленкі і дзіцячым хорам “Пявучыя музыканты”. На заняткох прысутнічалі педагогі музычных школ Мінска. Госць з Масквы адзначыў высокі ўзровень майстэрства і прафесійнай падрыхтоўкі харавых калектываў гімназіі-каледжа.

Загадчык кафедры тэорыі музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт **Марына Парахаўнічэнка**, якая распрацавала ўнікальную методыку харавога сальфеджыа, на адкрытым уроку з Хорам хлопчыкаў і юнакоў імя І. А. Жураўленкі прадэманстравала інтанацыйна-слыхавыя практыкаванні ў працы над партытурай і метады работы з хорам.

ПЁТР САВІНКАЎ:

— Я ехаў у Беларусь з вялікай цікавасцю. Ведаў, што тут вельмі моцная харавая школа, моцныя калектывы. Для мяне вялікі гонар пазнаёміцца з іх досведам.

У Маскве я займаюся ў асноўным з моладдзю ад 14 да 24 гадоў. Ёсць вопыт падобнай работы па абмене, але дагэтуль — толькі ў Расіі. Пры працы з хорам асноўнае — практыка. Майстар-класы, выступленні, у тым ліку на выездзе, заўсёды даюць новыя творчыя ўражанні. Яны пашыраюць кругагляд — і наш, і тых, да каго завітваем.

У гэты раз я сутыкнуўся з зусім новым гучаннем хору. Адна справа — чуць яго з боку. Зусім іншая — знутры, падчас дырыжыравання. Было вельмі цікава ўзаемадзейнічаць з хорам гімназіі-каледжа. Бо раней я дырыжыраваў толькі жаночымі і змяшанымі калектывамі. А тут хлопчыкі. Гэта свежы досвед, вельмі карысны і для мяне самога.

Па прапанове гаспадароў мы правялі майстар-клас па творах эпохі Адраджэння. Рэпеціравалі Псалом № 43 Мендэльсона. Працавалі над кампазіцыямі Сяргея Рахманінава і Мілія Балакірава.

Бібліятэка як феномен культуры

Галоўнай падзеяй года адмыслоўцы назвалі X Міжнародны кангрэс “Бібліятэка як феномен культуры”, што праходзіць днямі ў Мінску.

На форум, які разгарнуўся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі з 19 па 20 кастрычніка, з’ехалася больш за 400 дэлегатаў з краін блізкага і далёкага замежжа — Азербайджана, Арменіі, Інданезіі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, а таксама з Беларусі.

Гэта кіраўнікі і спецыялісты найбуйнейшых бібліятэк, музеяў, выдавецтваў, навукова-даследчых арганізацый і адукацыйных устаноў, вытворцы праграмнага забеспячэння, тэхнічных сродкаў, інфармацыйнай прадукцыі і прамысловага абсталявання для кніжных скарбніц.

На працягу 10 гадоў кангрэс з’яўляецца аўтарытэтнай дыскусійнай пляцоўкай для абмеркавання праблем і тэндэнцый у бібліятэчнай супольнасці. Вось і сёлета мерапрыемства прысвечана найбольш актуальным тэмам. На пленарных і секцыйных пасяджэннях, круглых сталах ідзе гаворка пра нацыянальныя асаблівасці і міжнароднае супрацоўніцтва кніжных скарбніц, ролю і месца гэтых устаноў, іх рэсурсаў, сэрвісаў у лічбавай экасістэме. Разглядаецца з’ява электроннай бібліятэкі як элемента лічбавай трансфармацыі бібліятэчнай справы, інавацыйна-праектная, сацыякультурная дзейнасць устаноў, сучасныя напрамкі ў абслугоўванні карыстальнікаў, перспектывы ўзаемаадносін кнігі, чытача і чытання.

Вынікам кангрэса стане рэзалюцыя, якая зафіксуе прынятыя рашэнні па далейшым развіцці бібліятэчнай галіны, рэалізацыі мэт і задач дзяржаўнай і міжнароднай культурнай палітыкі.

Форум арганізаваны Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД.

Культурная дыпламатыя ў лічбах

400
дэлегатаў з’ехалася на X Міжнародны кангрэс “Бібліятэка як феномен культуры”

9
краін блізкага і далёкага замежжа ўдзельнічае ў мерапрыемстве

10
гадоў кангрэс з’яўляецца аўтарытэтнай дыскусійнай пляцоўкай міжнароднай бібліятэчнай супольнасці

Падчас відэаканферэнцыі

Хто застанецца ў рэестры?

У прэс-клубе рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і Мастацтва” 16 кастрычніка адбылася відэаканферэнцыя на тэму “Заканадаўства аб арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў і рэалізацыя яго на практыцы”.

У студыі выступілі начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Ірына Дрыга і намеснік начальніка аддзела міжнароднага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі Алег Мазура. Падчас прэс-канферэнцыі прамоўцы атрымалі шэраг пытанняў ад аўдыторыі.

Як распавяла Ірына Дрыга, заканадаўства, якое рэгулюе парадак арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў у нашай краіне, уключае два асноўныя дакументы — Кодэкс аб культуры і Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 401, у якой зацверджана палажэнне аб рэестры арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў, прынятае летась 22 чэрвеня. Сёлета 19 верасня Пастановай № 608 у гэты дакумент былі ўнесеныя змены і дапаўненні.

У адпаведнасці з артыкулам 213 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры арганізатарамі культурна-відовішчных мерапрыемстваў з'яўляюцца юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь, індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраваныя ў Рэспубліцы Беларусь, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя і міжнародныя арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў. Фізічныя асобы ў такой ролі выступаць не могуць.

Рэестр уяўляе сабой базу звестак Рэспублікі Беларусь, якая ўключае інфармацыю аб арганізатарах культурна-відовішчных мерапрыемстваў з ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь, юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь, за выключэннем дзяржаўных органаў, дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і больш працэнтаў акцый (долей) знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і (або) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама замежных або міжнародных арганізацый, у тым ліку тых, што не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

Рэестр змяшчае інфармацыю аб назве юрыдычнай асобы або імені індывідуальнага прадпрымальніка, які з'яўляецца арганізатарам культурна-відовішчных мерапрыемстваў, звесткі аб кіраўніку або заснавальніку прадпрыемства, яго юрыдычны адрас і кантактную інфармацыю, а таксама код яго віду дзейнасці.

У адпаведнасці з артыкулам 214 Кодэкса, для арганізацыі культурна-відовішчнага мерапрыемства яго арганізатар абавязаны атрымаць спецыяльны дазвол — пасведчанне на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, што выдаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры.

Для атрымання пасведчання арганізатар культурна-відовішчнага мерапрыемства павінен звярнуцца з заявай па форме, устаноўленай Міністэрствам культуры, у структурнае падраздзяленне па культуры мясцовага выканаўчага і распарадчага органа абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, не пазней як за 10 дзён да запланаванага дня пачатку рэалізацыі ўваходных білетаў або дня правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства, калі рэалізацыя ўваходных білетаў не прадугледжана. Для атрымання пасведчання неабходна падаць заяву аб выдачы і прыкласці да яе праграму мерапрыемства з указаннем выканаўцаў і калектываў, а таксама твораў, якія будуць выконвацца падчас мерапрыемства.

У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 608, якая была прынятая 19-га і ўступіла ў сілу 23 верасня, унесены шэраг змен. Так, асноўныя від дзейнасці прэтэндэнтаў на ўключэнне ў рэестр мусіць быць звязаны з арганізацыяй культурна-відовішчных мерапрыемстваў, то-бок гэта мусіць быць дзейнасць у галіне выканаўчых мастацтваў або дзейнасць, якая спрыяе правядзенню культурна-відовішчных мерапрыемстваў.

Таксама прэтэндэнт мусіць падаць яшчэ і дакумент, які сведчыць аб наяўнасці ў яго стажу работы ў сферы арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў і аб самім такіх праведзеных ім мерапрыемствах за апошнія тры гады з даты падачы заявы, якія адпавядаюць такім крытэрыям, як эстэтычная каштоўнасць твораў, мастацкая цэласнасць і кампазіцыйная завершанасць мерапрыемства, яго мастацкае афармленне і выканальніцкае майстэрства ўдзельнікаў.

Варта падкрэсліць, што патрабаванне, якое тычыцца трох гадоў стажу, мае на ўвазе, што гэты тэрмін можа ахопліваць любы перыяд, калі арганізатар ажыццяўляў такую дзейнасць, то-бок гэта не абавязкова мусіць быць апошнія тры гады з даты падачы заявы. Пацвердзіць наяўнасць стажу можна выпіскай з працоўнай кніжкі або копіямі грамадзянска-прававых дамоў, якія з ім заключаліся. Таксама гэта можа быць даведка з месца працы, што сведчыць, на якой пасадзе і ў які перыяд арганізатар працаваў, або іншы дакумент такога кшталту.

Для таго каб высветліць, ці адпавядае стаж спецыяліста патрабаванням пастановы, рэкамендавана карыстацца выпускам № 30 адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасадаў служачых “Пасады служачых, занятых у культуры”, які можна знайсці на прававых парталах. З яго дапамогай можна высветліць адпаведнасць службовых абавязкаў пэўнаму віду дзейнасці. Досвед прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў можа быць ацэнены паводле грамадзянска-прававых дамоў, дамоў аказання паслуг або актаў выкананых работ.

Таксама неабходна падаць інфармацыю аб мерапрыемствах, праведзеных з удзелам заяўніка за апошнія тры гады з даты падачы заявы, прычым ён мог быць не абавязкова іх арганізатарам, а выконваць пэўныя функцыі па іх арганізацыі ў якасці рэжысёра, яго асістэнта, памочніка, адміністратара ці ў іншай якасці. Каб ацаніць мастацкі ўзровень гэтых мерапрыемстваў, прыкладаюцца фота- і відэаматэрыялы, магчыма, сцэнарныя планы. Гэтыя дакументы прымаюцца ў Міністэрстве культуры штодзённа з васьмі гадзін раніцы да пяці вечара, а ў чацвер — да васьмі вечара.

Асобы, якія ўключаныя ў рэестр арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў і хочуць працягваць сваю дзейнасць, каб пацвердзіць сваю адпаведнасць патрабаванням Пастановы № 608, таксама мусяць да 23 кастрычніка падаць у Міністэрства культуры дакументы аб пацвярджэнні стажу і інфармацыю аб праведзеных мерапрыемствах. Тое ж тычыцца і тых, хто падаў дакументы, але рашэнне па іх яшчэ не было прынятае. Гэтыя дакументы будуць разгледжаныя цягам трыццаці дзён, і па выніках разгляду камісія, якая працуе пры Міністэрстве культуры, прыме рашэнне аб пацвярджэнні статусу для арганізатараў, якія ўжо ўваходзяць у рэестр, або аб уключэнні ў яго, ці аб адмове, калі выяўленыя парушэнні.

Антон РУДАК
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Дарослыя, дзеці, анімацыя!

“Светлыя душы”, “Класікі і шахматы”, “Хлопчык-хуліган”. Якія яшчэ мультфільмы ў спісе найлепшых? Чым запомнілася “Анімаёўка-2023” і якія высновы зрабілі яе ўдзельнікі? Самае галоўнае і цікавае — у агляднзе “К”.

Узнагароду за найлепшы беларускі анімацыйны фільм атрымала карціна "Марныя спрэчкі!" каманды юных аўтараў з Гомеля

XXVI Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў “Анімаёўка-2023” праходзіў у Магілёве з 11 па 13 кастрычніка. Мерапрыемства, арганізаванае Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Магілёўскім абласным выканаўчым камітэтам, стала важнай падзеяй у творчым жыцці Беларусі. З кожным годам свята выклікае ўсё большую цікавасць у гледача і пашырае геаграфію: сёлета было заяўлена 188 фільмаў з 30 краін. Упершыню да“Анімаёўкі” далучыліся такія дзяржавы, як Перу, Парагвай, Катар. Як лічыць намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама **Валерый Малашка**, фестываль нездарма носіць званне міжнароднага. На форуме прадстаўлена анімацыя практычна з усіх кантынентаў, аднак гэта не перашкаджае людзям разумець адзін аднаго, бо творчасць не патрабуе перакладу:

— Мы гаворым на розных мовах, але тыя эмоцыі, якія нараджае анімацыйнае кіно, мы выдатна счытваем. Мультыплікацыйны фільм заўсёды нясе пазітыўную інфармацыю, дорыць дабро і дзіцяці, і даросламу, — кажа Валерый Малашка.

Па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення — начальніка ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры **Ірыны Адамовіч**, такая шырокая геаграфія фестывалю — добры знак для міжнацыянальнага культурнага супрацоўніцтва.

— Мастацтва — гэта сіла, якая наводзіць масты паміж краінамі, выбудоўвае і пашырае міжнароднае культурнае супрацоўніцтва, прыцягваючы тым самым усё больш сапраўдных сяброў і партнёраў. Фестываль спрыяе росту і развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы кінаіндустрыі і анімацыйных фільмаў, — адзначыла Ірына Адамовіч.

СУР'ЁЗНЫЯ ТЭМЫ

Конкурсная праграма ў гэтым годзе досыць змястоўная: былі прадстаўлены творы як для дзяцей, так і для дарослых. Як лічыць рэжысёр-аніматар, сцэнарыст, мастак-пастаноўшчык Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”, старшыня журы конкурсу анімацыйных фільмаў **Ірына Тарасава**, тэматычная накіраванасць карцін-удзельніц адсылае да нестабільнай сітуацыі ў свеце.

— Шмат работ, якія прымушаюць дзяцей задумацца і вучаць, а не проста забаўляюць. Сёлета павялічылася колькасць стужак, якія звяртаюцца да сур'ёзных аспектаў ваеннай тэмы, — каментуе рэжысёр. — Свет нестабільны, і, натуральна, анімацыя, як любы іншы від мастацтва, адлюстроўвае тэндэнцыі ў грамадстве.

Падобнымі назіраннямі падзяліўся і аніматар Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”, член экспертнай камісіі **Даніл Жугжда**. Паводле яго слоў, журы не чакала ўбачыць у конкурсных творах так шмат трывожных матываў.

— У работах вельмі адчуваецца адбітак часу. Практычна ўсе карціны напоўнены цяжкімі перажываннямі, гвалтам, пакутамі. Дапускаю, што гэта спецыфіка асабістага ўспрымання, аднак мы сапраўды не чакалі ўбачыць такую колькасць фільмаў на сур'ёзныя тэмы. Многія стужкі былі прасякнуты матывам ізаляцыі пасля пандэміі. Яны адлюстроўвалі пошук і жаданне чалавека знайсці кантакт з наваколлем або немагчымасць гэтага кантакту. Усе працы розныя: у некаторых якасць выканання на ваў-узроўні, у некаторых ідэя геніяльная, а ў некаторых усё камбінуецца, — тлумачыць Даніл Жугжда.

РОЗНЫЯ ПАДЫХОДЫ

У асноўным конкурсе анімацыйных фільмаў паўдзельнічала каля 60 прац, старанна адабраных экспертнай камісіяй. Ярчэй за ўсіх была прадстаўлена расійская анімацыя, аднак цікавасць журы выклікала і заходняя. Кожны канкурсант адрозніваецца падыходам, і гэта складана не прыкмеціць.

— Хтосьці вылучаецца перадусім ідэямі, іншыя размалёўваюць твор тэхнічна. Бывае і так, што аніматар не хоча распавядаць гісторыю, а спрабуе ўразіць фактурай і прыгажосцю планаў, — адзначае Ірына Тарасава. — Таксама заўважаецца нацыянальны каларыт, асабліва гэта тычыцца краін далёкага замежжа. Аднак здзіўляюць не толькі этнічныя асаблівасці. Мне, напрыклад, запомніўся мультфільм з Перу, зроблены ў класічнай дыснееўскай стылістыцы, у якім расказана вельмі пяшчотная філософская гісторыя пра адносіны Дзьмухаўца і Мурашкі.

ГОДНАЯ ЗМЕНА

У рамках трохдзённай праграмы для гасцей і ўдзельнікаў фестывалю праходзілі майстар-класы вядучых творцаў. І нездарма: адна з задач “Анімаёўкі” — выхаваць годную змену.

— Любы кінематаграфіст і аніматар нараджаюцца выключна з адной катэгорыі людзей — з гледачоў, — адзначае Ірына Тарасава. — Чым больш мы паказваем мультфільмаў, тым больш дзяцей мы прымліваем зваротнай сувязі. Магчыма, людзі захочуць аказацца па іншы бок экрана і ўвайсці ў прафесію. Спадзяюся, што наша айчынная анімацыя будзе расці, а фестываль — квітнець і заставацца сапраўдным святам дзяцінства.

Рэжысёр кінастудыі “Саюзмультфільм”, прадзюсар і сцэнарыст **Сяргей Струсеўскі** — часты госць “Анімаёўкі”. На думку адмыслоўца, гэтае мерапрыемства дае вялікі штуршок да развіцця дзіцячай анімацыі ў Беларусі.

— Папулярызацыя інавацыйнай творчасці сярод хлопчыкаў і дзяўчынак — адно з галоўных дасягненняў форуму. Яно не толькі дапамагае юным аўтарам удасканальвацца, але і з'яўляецца ранняй прафарыентацыяй, бо падчас “Анімаёўкі” праходзяць розныя сустрэчы і майстар-класы. Дзякуючы ёй у горадзе ўзнікла некалькі студый анімацыі, у якіх дзеці працуюць над ўласнымі мультфільмамі. І прытым вельмі паспяхова: гэтыя работы перамагаюць і на магілёўскім фестывалі, і на замежных конкурсах. У анімацыйнай галіне вельмі шмат прафесій, таму выдатна, калі дзяўчынкі і хлопчыкі развіваюцца ў гэтым кірунку. Так дзеці адразу разумеюць, што яны не бухгалтары і юрысты, а творчыя людзі, — лічыць Сяргей Струсеўскі.

Рэжысёр таксама акцэнтаваў увагу на тым, што падлеткі не толькі глядзяць фестывальную праграму, але і спрабуюць рабіць уласныя мультыплікацыйныя карціны:

— У юных аўтараў ёсць магчымасць ствараць фільмы — гэта чараўніцтва, якому пазайздросціш, — падкрэсліў Сяргей Струсеўскі. — Дзеці здольныя рэалізаваць сябе ў анімацыі і парадаваць стужкамі аднагодкаў, родных, блізкіх, пабочнага гледача. Такія працы заўсёды выклікаюць усмешку, бо адрозніваюцца асаблівай дабрынёй, наіўнасцю, а часам і нестандартнымі мастацкімі рашэннямі. Некаторыя дарослыя, у тым ліку прафесіяналы, са здзіўленнем назіраюць, як дзяўчынкі і хлопчыкі падбіраюць колер, выбудоўваюць кампазіцыю кадра. Яны парушаюць класічныя традыцыі і разбураюць шаблоны, але гэта цікава і арыгінальна. Дакладна магу канстатаваць, што ў Беларусі — таленавітыя дзеці, у якіх шмат магчымасцей для развіцця.

Культурная дыпламатыя ў лічбах

174 фільмы заяўлена у 2022 годзе

188 фільмаў заяўлена у 2023 годзе

больш за **30** краін удзельнічала ў фестывалі

У ВЫНІКУ

Найлепшым анімацыйным фільмам фестывалю стала праца “Светлыя душы” рэжысёра Анастасіі Жакулінай з Расіі. Найлепшым беларускім анімацыйным фільмам — “Класікі і шахматы” Наталлі Касцючэнка з Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”.

У конкурсе дзіцячай анімацыйнай творчасці ў намінацыі “Самы юны стваральнік анімацыйнага фільма” лаўрэатам прызналі Даніла Дзячкова з магілёўскай анімацыйнай студыі Diggie club (карціна “Хлопчык-хуліган”). Найлепшай сцэнарнай работай названы “Бунт у каралеўстве” Аляксандры Клінцовай з той жа студыі, найлепшым грамадзянска-патрыятычным анімацыйным фільмам — праца “У полымі вайны” рэчыцкай экамультыстудыі “Мульці-пульці”. Дзве перамогі ў аб'яднанні па інтарэсах “Свет фарбаў” з Гомеля: у намінацыі “Самы добры анімацыйны фільм” ушанавана стужка “Чароўны феерверк”, а ўзнагароду за найлепшы беларускі анімацыйны фільм атрымала карціна “Марныя спрэчкі!”. Твор “Дзяўчынка і рамонак” анімацыйнай студыі “17” Гомеля адзначаны ў намінацыі “За пераемнасць традыцый у педагагічным выхаванні (памяці Сухамлінскага В. А.). Прыз “За найлепшае акцёрскае агучванне” — у Цімафея Сагуна са студыі Diggie club (работа “Бюджэтная дзірка”). У намінацыі “За найлепшы сацыяльны фільм” першай аказалася стужка “Працягні руку дапамогі” ад калектыву аўтараў з Сацыяльна-гуманітарнага каледжа Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова.

Яўгенія ГАБЕЦ

Улада Цвікі

Форум шчырых творцаў

У горадзе над Дзвіной зноў пануе свята аўтарскай песні, паэзіі і візуальных мастацтваў! Адкрыты фестываль "Віцебскі лістапад" стартаваў сёння адразу на некалькіх пляцоўках абласнога цэнтра. Напярэдадні пра падзею нам расказала мастацкі кіраўнік праекта, рэжысёр Улада Цвікі.

— Мне пашчасціла атрымаць фестываль у яго 30-годдзе. Раней я бачыла ўвесь "Віцебскі лістапад". Бачыла розным. Я сядзела на прыступках вялікай залы, калі немагчыма было дастаць білеты на імпрэзы. Я назірала, як ён перафарматаваўся ў больш камерны. І калі "Віцебскі лістапад" быў даручаны мне як рэжысёру, вельмі захацелася зрабіць яму падарунак. Аўтарская песня не мае такой масавай папулярнасці, як раней, таму я вырашыла разгарнуць фестываль у своеасаблівыя "сезоны", накшталт парыжскіх.

Віцебск вельмі ганарыцца сваімі выбітнымі асобамі, мо нават больш за сталіцу. У нас ёсць Шагал, у нас ёсць Малевіч, у нас ёсць цэлая плеяда мастакоў віцебскай школы, у нас ёсць мастацка-графічны факультэт. І мне вельмі захацелася гэта паказаць. У англійскай мове, напрыклад, слова "артыст" абазначае ўсіх, хто выносіць творчасць на публічны разгляд. Хацелася паказаць, што мы ўсе жывём у адной прасторы творчай незалежна ад таго, у якім відзе мастацтва працуем. Першы раз адгукнуліся сталыя аўтары, члены Саюза мастакоў. І раптам атрымалася выстава. І раптам цытаты карцін сталі дэкарацыямі на сцэне. І ўсё загучала па-іншаму. Мы нібыта выйшлі з двухмернага фармату ў трох- і чатырохмерны. Стала зразумела, што нельга спыняцца. І цяпер у нас ёсць музычны, паэтычны і візуальны конкурсы.

ЛАБАРАТОРЫЯ СЛОВА

— У нас аматары сустракаюцца з прафесіяналамі. Узровень удзельнікаў розны, і далучыцца можа кожны — ці то дзіця, якое ўпершыню выходзіць на сцэну з інструментам, ці то сталы ўдзельнік, які ўжо паездзіў па фестывалях. Неістотна, на якой мове ты спяваеш. Важнае жаданне прычыніцца да падзеі і пачуць меркаванне аб сабе.

Другі год запар паэты працуюць у майстэрнях "Паэзія. Вольная тэматыка" і "Паэзія. Песенны тэкст". Майстры набіралі сабе канкурсантаў з дасланых заявак, і канкурсанты выбіралі сабе майстра. Вельмі сур'ёзны адсеў. Удзельнікі ідуць да таго, хто ім падабаецца. І гэта лабараторыя. Творцы абмяркоўваюць работы адно аднаго, і затым майстар вызначае найлепшага аўтара.

У межах "Лістападнага кватэрніка" адбудуцца майстар-класы ад членаў журы Алеся Чумакова з Мінска і Сяргея Суворава з Санкт-Пецярбурга. Паэтка з Масквы Ніка Батхен правядзе майстар-клас пра інтуітыўную і тэрапеўтычную паэзію.

ВЫПРАБАВАННЕ НА ШЧЫРАСЦЬ

— Жывое выкананне і жывы акампанемент накладваюць пэўныя складанасці. І зрабіць гэта на раз немагчыма. Мала заплаціць за аранжыроўку. Калі гэта не тваё — ты не зробіш. Можаш сядзець спяваць перад камерай і пачувацца ўпэўнена, рабіць мноства дубляў і найлепшы публікаваць у інтэрнэце.

Аднак на сцэну паток можа не пайсці, бо павінна быць нейкая адчайная матывацыя. Трэба не толькі мець добрую тэхніку, але ахвоту быць артыстам — чалавекам, якому падабаецца, што на яго глядзяць.

Вельмі многія эстрадныя артысты хаваюцца за створаны імідж. Насамрэч яны ўвогуле іншыя. З аўтарскай песняй так не працуе. Рэдка атрымліваецца паказаць нешта іншае, чым ты ёсць. Удзельнікі "Віцебскага лістапада" — такія шчырыя людзі, якія маюць смеласць выходзіць і расказваць пра сябе. Нехта робіць гэта вельмі наіўна, хтосьці — прафесійна. Але лгаць не атрымліваецца.

Да прыкладу, паэтычны канцэрт сёлета называецца "Мама чинит глобус". Ён прысвечаны сямейным каштоўнасцям, любові, якая часта застаецца незаўважанай. Мы мала пра гэта кажам і мала гэта цэнім. Тэма нібыта за кадрам.

Калі людзі наядуцца пластыку, хлусні і пафасу на пустым месцы, ім захочацца сапраўднай чалавечай энергіі. Гэтага не можа не здарыцца. Мне падаецца, што праз нейкі час людзі будуць вельмі шмат плаціць за тое, каб прыйсці ў пакой без ніводнай разеткі і лямпачкі — і каб ім ужывую нешта распавялі, сыгралі, спелі, нешта ім перадалі.

БЛІЖЭЙ ДА НЕБА!

— Мы думалі, што 37-ы фестываль будзе сціплым, бо канцэртная зала, якая заўсёды гудзела "Віцебскім лістападам", цяпер на рамонце. Мы можам выкарыстоўваць толькі фае і пару кабінетаў. Там сёлета адбудуцца музычныя кватэрнікі і майстэрні для ўдзельнікаў намінацыі "Паэзія". А фестываль жа вырас! Ён ужо не змяшчаецца ў невялікую залу на сто чалавек. І таму мы пашырыліся геаграфічна — на карце горада. Работы ўдзельнікаў намінацыі "Візуальныя мастацтвы" выстаўлены ў мастацкім музеі. І неістотна, колькі гадоў аўтару. Падумайце, які гэта падарунак дзецям! А раптам сярод іх расце будучая зорка нашай мастацкай школы? Гала-канцэрт адбудзецца ў філармоніі, а турнір паэтаў прыме "Духаўскі круглік" — вежа, з якой увесь горад як на далоні. Паэты будуць там, дзе ім належыць быць, — бліжэй да неба!

Занатаваў Даніл ШЭЙКА
Фота з архіва фестывалю

Гомельскі маладзёжны тэатр стаў лаўрэатам фестывалю "Суайчыннікі" ў Расіі.

Акцыя "Тэатральная раніца для ўсёй сям'і" прайшла ў Вялікім тэатры.

У магутнай бронзе — узнёслая паэзія

Скульптуры Сяргея Гумілеўскага ў літаратурных музеях выстаўляюцца не радзей, чым у мастацкіх, бо значная частка яго творчасці прысвечана нашым выбітным паэтам. Аўтар робіць віртуозныя партрэты класікаў і дзіўным чынам пераносіць у бронзу... іх вершы. Зрэшты, не толькі майстроў слова ўвасобіў адмысловец. Сам-адзін і ў суаўтарстве з бацькам — народным мастаком Беларусі Львом Гумілеўскім — стварыў дзясяткі манументальных і станковых прац, што ўслаўляюць выдатных сыноў беларускай зямлі.

Сёлета Сяргею Львовічу — 60. Да круглай даты ён прымеркаваў маштабную выставу, на якой паказаў уласныя скульптуры розных гадоў, бацькаву спадчыну і работы сямейна-творчага тандэма. У працяг рэтраспектывы "К" пагутарыла з мастаком — аб пройдзеным шляху і шляху, што адкрываецца далей.

— Сяргей Львовіч, падаецца сімвалічным, што нядаўнюю юбілейную экспазіцыю вы зладзілі ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Гэты чалавек быў блізкі з вашым бацькам, адыграў ролю ў вашым прафесійным станаўленні. Што найперш згадваецца пра майстра?

— Так, бацька па-сапраўднаму сябраваў з Міхаілам Андрэевічам. У іх была нейкая духоўная сувязь. Нават не ведаю прыкладаў такіх адносін паміж мастакамі.

А я ў 1994 годзе пайшоў у акадэмічныя майстэрні пад кіраўніцтвам Міхаіла Андрэевіча. Ён, акрамя таго, што быў вялікім прафесіяналам у жывапісе, выдатна разумеў скульптуру. На жаль, цяпер такое рэдкасць. Калі Савіцкі казаў пра скульптуру, то абапіраўся на вялікія прыклады — Радэна, Бурдэля, Маёля.

На выставе "Шлях" дэманстраваўся твор "Юнацтва" — справаздачная работа, якую па заканчэнні я мусіў пакінуць у акадэмічных майстэрнях. Мне хацелася ўвасобіць яе ў бронзе. Спытаў у Міхаіла Андрэевіча — ён прыйшоў, паглядзеў і даў згоду. Гэта быў першы выпадак у гісторыі майстэрняў, калі Савіцкі дазволіў перавесці скульптуру ў бронзу. Раней усім казаў: "Перавядзі ў гіпс, бронзы работа яшчэ не вартая".

Хоць мы былі ў добрых адносінах з Міхаілам Андрэевічам, аказалася прыемнай нечаканасцю тое, што ён прыйшоў на адкрыццё маёй першай персанальнай выставы ў былым доме-майстэрні Андрэя Бембеля на вуліцы Якуба Коласа.

— Хто яшчэ з мастакоў дапамагаў вам пракладваць творчы шлях?

— Калі казаць пра настаўнікаў, то варта згадаць мастацкую школу. У Парнаце ў мяне выкладаў Леанід Давідзенка. І цяпер я разумею, чаму мы дзецьмі ставіліся да яго з вялікай павагай. Побач з намі ў яго была майстэрня, і мы, малыя, назіралі, як ён вельмі хутка высякаў творы з дрэва. Заглядваеш, гадзіна праходзіць — а там ужо нешта атрымалася. Лічу, так і павінна быць. Мастак мусіць навучаць сваім прыкладам, паказваць, як і што сам робіць. Малюнак выкладала Антаніна Лапіцкая, і яе падыход мне таксама вельмі падабаўся.

Сяргей Гумілеўскі. "А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю (Максім Багдановіч)". Сілумін, 1994

Увогуле, я дужа рады, што ў гэтай школцы вучыўся. Дарэчы, са мной там раслі людзі, якія ўжо ўвайшлі ў гісторыю нашага мастацтва. Я да паступлення цікавіўся акадэмічнай творчасцю, маляваў, але нейкі дух беларускасці з'явіўся менавіта ў Парнаце. Мы юнакамі хадзілі на лекцыі Ермаловіча. Слухалі пра нашу мінуўшчыну. Гэта моцна захапіла, і сёння ўжо немагчыма пераканаць мяне ў іншым. Я застануся са сваім разуменнем.

— Але ж і бацька значна паўплываў на тое, што вы шмат працуеце над вобразамі выдатных дзеячаў беларускай культуры?

— Сапраўды. Да Купалы я прыйшоў праз бацьку. І цяпер у майстэрні ёсць кніжкі, нейкія матэрыялы пра паэта. Разам з бацькам мы стварылі скульптуру Песняра для Масквы, дзе скончылася жыццё класіка. Пазней я зрабіў памятны знак для Радашковіцкага касцёла, дзе хрысцілі Купалу. І гэта цэлы шлях паэта ад нараджэння да смерці. Для мяне гэта значныя працы. Рады, што рэалізаваў іх.

— Вы часта згадваеце бацькавы словы, што ў юнацтве чалавек мусіць падабраць сабе хамут, які будзе несці ўсё жыццё. Атрымліваецца, магчымасць прымераць мастакоўскую долю вы мелі з самага дзяцінства.

— Так, я малым бываў у бацькавай майстэрні на вуліцы Гая. Усе скульптары тады час ад часу ляпілі Леніна дзеля грошай. Я гэта не ўспрымаў. Казаў: "Не, Леніна я не хачу рабіць". Мне было цікава іншае. Тады ішлі фільмы пра індзейцаў. І гэтая тэма мяне настолькі захапіла, што падчас уступных іспытаў у школку вылепіў індзейцаў з гліны. Аднойчы прыйшоў у бацькаву майстэрню, калі ён стараў вялікі рэльеф, прысвечаны Коласу. Я глядзеў на ўжо гатовую скульптуру, а потым узяў разцы — і з адваротнага боку зрабіў галаву індзейца. А ўжо ў Парнаце пачаў сур'ёзна цікавіцца нацыянальнай тэмай.

— Вы шмат працавалі разам з бацькам, мноства работ выпусцілі ў суаўтарстве. Як удавалася ўжываць ў адной майстэрні? Ці складана вам было гадаваць і захоўваць творчую індывідуальнасць?

— У кожнага свой падыход, але мы разумелі адзін аднаго. Бывала, спрачаліся. Аднак прынцыповых канфліктаў не ўзнікала. Як мне падаецца, у мяне творы больш узнёсла-рамантычныя, а ў бацькі больш патрыятычныя па сутнасці. Але ёсць агульнае бачанне. Шмат жа сумесных работ! Недзе пачынаў бацька, а я падхопліваў. Ёсць такія працы (напрыклад, кампазіцыя "Балет"), у якіх хутчэй я вёў рэй, а тата падтрымліваў. Цяпер, вядома, не стае бацькі, яго парад і падказак.

— Якія задачы вы ставіце сабе як захавальніку спадчыны Льва Мікалаевіча?

— Хацелася б адшукаць нейкую залу для пастаяннай экспазіцыі, зрабіць музейчык, каб бацькавы творы бачыла шырокае кола людзей, а не толькі я. Выдатна, калі знойдзецца такая магчымасць у Мінску. Можна ў Нясвіжы адкрыць адмысловую залу. Я падарыў бы гораду нейкія працы.

— Варта нагадаць, што менавіта ў Нясвіжы пачынаўся творчы шлях Льва Мікалаевіча...

— Быў 1944 год. Беларусь ужо вызвалілі. Неяк мая бабуля пабачыла ў горадзе аб'яву, што Сеўрук набірае дзяцей у студыю. І бацька туды пайшоў займацца. Да канца дзён ён богатварыў свайго настаўніка. Да юбілею Міхаіла Канстанцінавіча вылепіў барэльеф для надмагілля і такім чынам ушанаваў памяць мастака. Сеўрук працаваў у ратушы. Калі малыя завітвалі да яго, а дзверы былі зачынены, хлопчыкі і дзяўчынкі гучна кліклі выкладчыка. Ён адкрываў акно ў вежы, выглядваў — і спускаўся да дзяцей. І калі мы праз столькі гадоў прыязджалі ў Нясвіж, падыходзілі да ратушы і з усмешкай крычалі: "Міхаіл Канстанцінавіч!"

— Значную частку вашага набытку складаюць партрэты Максіма Багдановіча і работы, натхнёныя яго творамі. Чым абумоўлена такая ўвага да паэта?

— Калі да Купалы я прыйшоў дзякуючы бацьку, то Багдановіча адкрыў сам яшчэ ў школьным узросце. Гэтая постаць для мяне святая. Настолькі арганічна Максімава творчасць ўвайшла ў маё жыццё, што і цяпер не магу без яе, памятаю большую частку вершаў.

Калі ў мастацкай школцы мы адчувалі сябе вальней, то ў інстытуце была строгая праграма, свае тэмы — ваенная, рэвалюцыйная. Але мяне больш цягнула да рамантычных. І дыпломную працу я зрабіў паводле Багдановіча — "Помніш, калі я спаткаўся з табою".

Сяргей Гумілеўскі. "Францішак Скарына". 1994

Леў і Сяргей Гумілеўскія (фота з архіваў "К")

У 1999 годзе быў абвешчаны конкурс на стварэнне надмагільнага помніка Багдановічу ў Ялце, і мы з бацькам перамаглі. Стаяла задача абысціся без каляровых металаў: бронзавыя элементы на гэтых могілках папросту краді. Скульптуры вырабілі са светла-шэрага граніту. З аднаго боку, трэба выконваць умовы конкурсу. З другога, такі матэрыял дазволіў стварыць светлы вобраз песняра чыстае красы. У аснове — тонкая класічная калона. Чаму? Таму што паэзія Багдановіча тонкая і ўзнёслая, таму што ён звяртаўся да класічных формаў — ронда, трыялета, санета. Атрымалася вельмі арганічна.

— У многім вы ўплываеце на тое, якімі асобы нацыянальнага маштабу застануцца ва ўяўленні народа. Гэта вялізная адказнасць. Як знайсці тое самае аблічча гістарычнай постаці?

— Каб стварыць нейкі вобраз, трэба спачатку добра вывучыць тэму і асобу, знайсці сутнасць з'явы і чалавека. Бацька любіў паўтараць такія словы: "Рух цела ёсць рух тваёй душы". Калі ты ўхапіў унутраную сутнасць, работа атрымаецца.

— Вы шмат працуеце не толькі з бронзай, але і з рознымі пародамі дрэва, з каменем. Чым гэтыя матэрыялы вас прыцягваюць?

— Вядома, пад кожны твор шукаеш свой матэрыял. Творы з каменю для мяне па-свойму каштоўныя, бо яны існуюць у адзіным экзэмпляры. Калі ў бронзе пры жаданні зробіш і дзве, і тры адліўкі, то ў выпадку з каменем паўтор немагчымы. Бывае, што такі матэрыял нібыта дыктуе вобраз. Напэўна, гэта з дзяцінства ў мяне павялося. Бачыш валун — і нейкі вобраз у ім прыкмячаеш. А дрэва падабаецца мне цеплынёй. Яно нібыта набрала энергіі ад нашай зямлі, насыцілася яе сокамі. І гэта таксама своеасаблівая філасофія.

— Чаму для вас важна працаваць у нацыянальнай тэматыцы? Гэта ўнутраная патрэба ці адчуванне адмысловай місіі, ускладзенай менавіта на вас?

— Гэта тое, што мне хочацца рабіць. Я ніколі не ўдзельнічаў у конкурсах, нецікавых мне. Напрыклад, адзін з апошніх твораў, якім ганарыся, — надмагільны помнік Генадзю Гарбуку. Гэта знакавая асоба для мяне. Я крышку ведаў акцёра асабіста, люблю яго ролю Лапатухі ў "Чорным замку Альшанскім" і шматлікія тэатральныя працы.

— Ці шмат у вас нязздзейсненых праектаў?

— Па планшэтах налічыў больш за сто. Можна нават зрабіць асобную выставу нерэалізаваных праектаў. Гэта помнікі Чапскаму, Глебу Менскаму, Уладзіміру Караткевічу, Максіму Танку і іншым асобам. Яшчэ ў 1990 годзе ладзіўся конкурс на стварэнне скульптуры Максіма Багдановіча ў Гродне. Выбралі мой праект, але справа неяк спынілася. Потым у 2011-м абвясцілі конкурс ужо на помнік-бюст — перамог наш з бацькам праект. Аднак дагэтуль ён стаіць у майстэрні.

Вельмі хацелася б увасобіць Мікалая Радзівіла Сіротку для Нясвіжа. Гэтая скульптура проста неабходная. Таму што ў часы князя фарміравалася аблічча горада, якое мы маем сёння. Мікалай Радзівіл Сіротка запрасіў італьянца Яна Марыю Бернардоні, які пражыў у Нясвіжы 14 гадоў і спраектаваў касцёл ды замак. Мы з бацькам распрацавалі ідэю, зрабілі мадэль, але далей справа тармозіцца.

Некаторыя станковыя скульптуры можна было б таксама перавесці ў маштаб, каб дапоўніць імі гарадскую прастору. Рэалізавана маленькая частка задуманага. А для кожнага мастака ж вялікае шчасце, калі добрая праца пачынае жыць у нейкім асяроддзі.

Даніл ШЭЙКА

Фрагмент экспазіцыі "Шлях"

Стройны збор

Маштабны выставачны праект "Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм" працуе ў Нацыянальным мастацкім музеі. Экспазіцыя знаёміць з агульнымі і лакальнымі асаблівасцямі строяў шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

Галоўнай скарбніцы краіны не ў навінку прэзентаваць работы майстрых-сялянак. Прыгадаем хаця б экспазіцыйныя хіты апошніх гадоў — "Жаночы род" і "Чырвоны — код нацыі". У межах гэтых праектаў узоры народнага мастацтва дэманстраваліся нароўні з шэдэўрамі прафесіяналаў. Аднак права на сольны паказ творы самародкаў атрымалі ўпершыню. Ды і маштаб неверагодны: прадстаўлена пад 80 касцюмаў, пераважная большасць якіх — аўтэнтычныя, датаваныя канцом XIX — пачаткам XX стагоддзя.

Аснову выставы складаюць творы традыцыйнага беларускага ткацтва са збору Нацыянальнага мастацкага музея. Частка з іх перад з'яўленнем на публіцы прайшла рэстаўрацыю. Але, каб карціна была поўнай, куратарам давялося звярнуцца і да іншых калекцый. Прыкладам, з Віцебскага абласнога краязнаўчага музея прывезлі фрагменты тканін у тэхніцы рамізнага ручнога ткацтва і дошкі для набойкі сярэдзіны XIX стагоддзя. Таксама ў экспазіцыі можна ўбачыць прадметы з фондаў Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, музеяў і дамоў рамёстваў Гродзеншчыны і Віцебшчыны.

Дарэчы, першым класіфікаваў традыцыйнае адзенне паводле рэгіянальных асаблівасцей Міхась Раманюк. Славуты даследчык зладзіў дзясяткі этнаграфічных экспедыцый, па выніках якіх стварыў больш за 130 рэканструкцый. Частка гэтага набытку, а таксама фотаздымкі з паездак дапоўнілі экспазіцыю. Побач дэманструюцца малюнкі строяў і старонкі з альбома "Беларускі народны арнамент Палесся" выбітнага этнографа Лявона Баразны.

Яшчэ адна разыначка выставы — на ёй паказана звыш 50 спосабаў нашэння жаночых галаўных убораў. Вядома, найбольшая ўвага нададзена намітцы. Хоць падобны элемент адзення быў у розных краінах і ў розныя часы, толькі беларусы захавалі намітку да канца XIX — пачатку XX стагоддзя.

У Брэсцкім тэатры лялек прэзентавалі прэм'еру — "Еўфрасіння Полацкая. Святыя літары".

Гастролі Вялікага тэатра Расіі ў Мінску пачнуцца 22 лістапада.

Вячаслаў Нікіфараў

“Тэатральнае” кіно

Супраць тыпажу і абставін

У снежні 2024-га будзе святкавацца векавы юбілей беларускага кіно. Але мерапрыемствы да гэтай круглай даты пачаліся ўжо цяпер: у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага прайшоў майстар-клас заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, рэжысёра Вячаслава Нікіфарава.

Арганізатарамі выступілі не толькі тэатр, але і Акадэмія навук, Беларуская гільдыя акцёраў кіно і Валянціна Сцяпанава, якая шмат гадоў была дырэктарам фестывалю “Лістапад”. Месца правядзення абралі невыпадковае. У свой час Вячаслаў Аляксандравіч сябраваў з колішнім мастацкім кіраўніком Рускага — земляком Барысам Луцэнкам. Яны ў дзяцінстве нават купаліся ў адной рэчцы! Дарэчы, Барыс Іванавіч запрашаў Нікіфарава паставіць штосьці ў тэатры, ды, на жаль, не здзейсніўся. Затое ў Вячаслава Аляксандравіча здымаліся такія зоркі горкаўскай трупы, як Вольга Клебановіч, Сяргей Чэкерэс, Руслан Чарнецкі, Таццяна Баўкалава і іншыя.

Майстар-клас быў прызначаны для артыстаў, найперш для маладых. Але на яго завіталі і больш сталыя, нават такі знакаміты рэжысёр і акцёр, як Валерый Анісенка. І не дзіва. Вячаслаў Нікіфараў — адно з найбольш знакавых імёнаў айчыннага кінематографа. Гэта творца, якога можна аднесці да шасцідзясятнікаў. За фільм “Бацькі і дзеці” Вячаслаў Аляксандравіч быў уганараваны Дзяржаўнай прэміяй СССР. Адным з першых адмысловец звярнуўся да чарнобыльскай тэмы, зняўшы ў 1993-м стужку “Душа мая, Марыя”.

Майстар-клас мэтр таксама зрэжысіраваў: сустрэча прайшла пад сціпаную музыку яго любімага кампазітара — Моцарта. Нікіфараў распавядаў пра такія аспекты рэжысёрскай справы, як канфлікт, характар, дзеянне. Калісьці думкі пра гэта творца надрукаваў у кнігу нумарах часопіса “Нёман”. Упэўненыя, тыя развагі ўвойдуць у кнігу Вячаслава Аляксандравіча “Ds: рэжысёр” (таямнічае Ds перакладаецца як “дыягназ”).

Не ведаю, як наконт дыягностыкі, але ўжо літаральна першая фраза Нікіфарава скарыла нечаканасцю: маўляў, сусвет — гэта наша... пясочніца. Тая ёмістая метафара адразу пагрузіла прысутных у мікра- і макракосмас, а далейшы роздум засведчыў добрую эрудыцыю выступоўцы. У той дзень рэжысёр, па яго прызнанні, адчуваў сябе не лепшым чынам. Але сцэна папраўдзе вылечвае, і прысутныя маглі пераканацца ў справядлівасці гэтых слоў. З кожнай хвілінай майстар натхняўся ўсё больш, у ім уключыўся сапраўдны акцёр, які ведае, чым утрымліваць і захапляць залу.

Дарэчы, у біяграфіі Вячаслава Аляксандравіча было і акцёрства: яшчэ з 15 гадоў ён іграў у студыі Рускага тэатра ў Абакане. Ды ўвогуле, Нікіфарава можна без ваганняў назваць “акцёрскім рэжысёрам”. І не толькі таму, што за больш як паўстагоддзя творчай работы майстру давялося супрацоўнічаць амаль з трыма тысячамі артыстаў. Галоўнае ў іншым: у стужках Вячаслава Аляксандравіча заўжды ёсць баланс між рэжысёрскай канцэпцыяй і ўвагай да акцёраў. Таму стрыжнем майстар-класа стаў заклік да артыстаў ніколі не іграць тыпажы і прапанаваныя абставіны. Менавіта такія падыходы, на жаль, дамінуюць у дрэнных серыялах, але ж характар любога героя павінен быць аб’ёмным і ўключаць у сябе самыя разнастайныя абертоны, адценні чалавечых рыс і пачуццяў. Нікіфараў згадаў, як здзіўлялася расійская актрыса Вікторыя Талстаганава, калі ён падчас падрыхтоўкі да здымак у серыяле “Кат” прапанаваў пачытаць “Медэю” Еўрыпіда, “Так гаварыў Заратустра” Ніцшэ, “Дэмана” Лермантава. Маўляў, навошта? І толькі потым артыстка ўсвядоміла, што гэта дапамагло ёй зразумець неадназначнасць гераіні, немагчымасць увасобіць персанажа ў адной плоскасці. Але ж ёсць і тое, што сыграць немагчыма. На думку майстра, гэта харызма, абаянне, разняволенасць. Тым не менш набытае рамяство з цягам часу можа ўзрасці да майстэрства.

Ну а сустрэча перарасла ў град пытанняў і працяглую аўтограф-сесію. Нікіфараў імкнуўся не толькі знайсці для кожнага асаблівыя словы, але і намаляваць штосьці смешнае: настрой у творчай прафесіі — справа важная.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Падчас майстар-класа

Музыка “Восені” і не толькі

Ледзь Беларуская дзяржаўная філармонія адкрыла сезон, як ужо 12 кастрычніка тут пачаўся 49-ы Міжнародны фестываль мастацтваў “Беларуская музычная восень”.

Сярод цікавінак мінулых тыдняў — заключныя канцэрты VII Міжнароднага фестывалю “У Шэметаве ў Шастаковічаў”, што праходзіў у розных кутках Міншчыны. Асабліва ўразіў французскі габаіст Жэром Гішар — нерэальнай прыгажосцю гуку, бязмежнай музычнасцю. Дастаткова згадаць, наколькі глыбокімі па сэнсе, а не толькі віртуознымі, атрымаліся ў яго сольныя кадэнцыі ў канцэрце Моцарта. У першай частцы яны гучалі амаль як рамантычнае прызнанне, нягледзячы на безліч галавакружных класіцысцкіх пасажаў. У другой — як пранікнёная лірыка-філасофская прамова. У трэцяй — як чарада пытанняў без адказаў.

Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр паспеў правесці два канцэрты, па традыцыі адкрыўшы сезон беларускай прэм’ерай. Гэта твор Галіны Гарэлавай “100 секунд”, прысвечаны мастацкаму кіраўніку і галоўнаму дырыжору калектыву, народнаму артысту Беларусі Аляксандру Анісімаву.

Дзяржаўны камерны аркестр на чале з Яўгенам Бушковым здзівіў замежнымі навінкамі. Праграма “Голас нябесны” ўключала музыку сучасных кампазітараў з Балгарыі, Вялікабрытаніі, Расіі. Ды і чарговы канцэрт для дзяцей у межах цыкла “Класіка — гэта класна!” складаўся з дзвюх расійскіх прэм’ер: музычнай казкі “Чароўная дудачка” Эрыка Фрайтага і Самаварнай кантаты Кацярыны Мельнікавай. Прычым некаторыя аўтары спецыяльна прыязджалі паслухаць цяперашняе беларускае выкананне сваіх твораў і запэўнівалі, што яно лепшае за ўсе астатнія.

А колькі ўсяго будзе на “Беларускай музычнай восені”! У фестывальнай праграме, якая завершыцца акурат у апошні дзень лістапада, — амаль тры дзясяткі выбітных выступленняў. Акрамя як на інструментальныя вечарыны, звернем увагу на вакальныя. 31 кастрычніка Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы пад кіраўніцтвам Вольгі Янум прэзентуе “Іншую прастору”, створаную з медытатыўных кампазицый, у тым ліку беларускіх. А 9 лістапада Дзяржаўны камерны хор на чале з Наталляй Міхайлавай пакажа “Нараджэнне гуку”. Менавіта пакажа, бо спевы будуць суправаджацца пластыкай. Сярод удзельнікаў фестывалю — не толькі найлепшыя айчынныя музыканты, але і знаныя салісты і калектывы з Расіі, Кубы. Палітра жанраў, стыляў і відаў мастацтва — самая размаітая: акрамя акадэмічнай музыкі, ёсць і эстрада, і джаз, і харэаграфія, якую прадставяць на адмысловых вечарах. Адным словам, падрыхтаваны падзеі на ўсе густы, акрамя дрэннага.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Ансамбль народнага танца “Крокі”

Маленькімі крокамі да вялікіх перамог

Нядаўна беларуская дэлегацыя вярнулася з XVII Маладзёжных Дэльфійскіх гульняў, якія праходзілі ў Бішкеку. З Кыргызстана нашы суайчыннікі прывезлі не толькі прыемныя ўспаміны, але і сем медалёў. Сярод пераможцаў — ансамбль народнага танца “Крокі”. Як дасягнуць поспеху і заматываваць юных талентаў на высокі вынік, распавяла кіраўнік калектыву Таццяна Шчучко.

— Таццяна Мікалаеўна, прыміце шчырыя віншаванні! Калі ласка, раскажыце, як вы пазнаёміліся з танцам.

— Я дачка ваеннага ўрача, і так атрымалася, што ў часы СССР мы ездзілі па розных краінах. Я нарадзілася на Далёкім Усходзе, хоць бацькі — карэнныя беларусы. Там і ўзнікла любоў да танца, калі мяне прывялі ў ансамбль “Вихрята”. Пазней усёй сям’ёй вярнуліся ў Беларусь, і я паступіла ў Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў.

Затым працягнула адукацыю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры харэаграфіі. Пасля два гады па размеркаванні працавала ў звычайнай школе, але заўсёды марыла навучаць таленавітых дзяцей у Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў. І вось ужо 12 гадоў выкладаю народны танец у гэтым цудоўным месцы.

— А як зарадзілася ідэя стварыць ансамбль?

— Калектыў складаецца з маіх вучняў. Я набіраю новыя курсы і пачынаю працаваць з імі. Заняткі праходзяць у каледжы мастацтваў у вольны ад навучання час. У 2019 годзе мы ўпершыню паспрабавалі сілы на конкурсе Folk of dance у Маскве. Пасля паспяховага выступлення ў галаве круцілася думка: у якім фармаце працягнуць дзейнасць? Затым стала традыцыяй штогод выязджаць на размаітыя творчыя спаборніцтвы. Былі розныя наборы дзяцей, адпаведна, усе склады ансамбля непадобныя. Цяпер у калектыве 19 чалавек ва ўзросце 18—19 гадоў.

— Якія ў “Крокаў” апошнія дасягненні на айчынных і міжнародных творчых пляцоўках?

— Летась мы сталі лаўрэатамі другой ступені I Рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва “Дэнс кангрэс”. Тады вырашылі не здавацца, карпатліва працавалі і ў гэтым годзе атрымалі дыплом першай ступені. Таксама занялі першае месца і ўзялі спецпрыз на фестывалі “Тэрыкон” у Салігорску. Вясной ездзілі ў Санкт-Пецярбург на “Неўскія перспектывы” — удастоіліся Гран-пры. Але, вядома ж, самы яркі і свежы ўспамін — залаты медаль на XVII Маладзёжных Дэльфійскіх гульнях.

У гэтым плане я вельмі актыўная. Нават калі назапашваецца стома і здаецца, што трэба больш працаваць у класе, рыхтавацца да іспытаў, мы ўсё роўна не спыняем удзелу ў конкурсах. Кожнае выступленне на падобных мерапрыемствах — гэта пашырэнне меж, знаёмства з іншымі культурамі. Ды і ўдзельнікі калектыву растанцоўваюцца, становяцца больш упэўненымі і вучацца новаму.

— А ці адрозніваюцца беларускія і замежныя гледачы?

— Мы пастаянна ўдзельнічаем ва ўсіх святочных праграмах у Палацы Рэспублікі, а таксама ў канцэртах, прымеркаваных да Дня горада, Дня народнага адзінства. Наогул, у Беларусі цёплы і ўдзячны глядач, бо ў нас у менталітэце закладзена лагоднасць і спагадлівасць. Напрыклад, у Бішкеку ўсе адзначылі нашу цёплую энергетыку. Беларуская творчасць для замежнікаў — экзатычная. Яны могуць доўга разглядаць вышыўку на касцюмах і ўвесь час просяць сфатаграфавацца. У нашых традыцыях — актыўна перамяшчацца па сцэне і ствараць эфект лёгкасці, што заўжды выклікае захапленне ў любой публікі.

— Давайце больш падрабязна пагаворым аб паездцы на Дэльфійскія гульні. Якія нумары вы прадстаўлялі і як калектыў сустракалі ў Кыргызстане?

— З Беларусі нас ляцела 25 чалавек. Усе былі настроены добразычліва, падтрымлівалі адзін аднаго, бо творчыя людзі многае разумеюць без слоў.

У Бішкеку каманду сустрэлі на найвышэйшым узроўні і вельмі душэўна: забяспечылі годныя ўмовы пражывання, пазнаёмілі з нацыянальнай кухняй, правялі экскурсіі, а ў апошні дзень арганізавалі незабыўную паездку ў горы.

На творчым форуме мы паказалі тры нумары: традыцыйныя “Крыжачок” і “Лявоніху”, іграўвы-вобразны “Аднойчы ля ракі” (у каледжы аркестр запісаў для выступлення музыку — гэта аранжыроўка песняроўскіх “Ручнікоў”). Конкурс у намінацыі “Народны танец” праходзіў у Бішкекскім харэаграфічным вучылішчы, дзе мы трапілі ў знаёмую атмасферу. Кожнаму калектыву выдзелілі светлы клас для рэпетыцый. У Кыргызскай дзяржаўнай філармоніі праводзілі закрыццё Гульняў, на якім мы паказалі пераможныя нумары. Мяркую, нягледзячы на доўгі пералёт, мае вучні выступілі цудоўна: гэта было акадэмічна і вельмі эмацыйна.

— Калі ласка, падзяліцеся планамі на найбліжэйшы час.

— Хацелася б стварыць асобны пастаянны ансамбль у Мінскім каледжы мастацтваў. Мае танцоры, несумненна, крыніца натхнення, бо дзякуючы іх здольнасцям мы разам дасягаем вышынь. Не буду ўтойваць, што я шмат патрабую ад удзельнікаў калектыву, але ў адказ бачу вочы, напоўненыя энергіяй і прагай новых падзей. Упэўнена, напярэдзе нас чакае багата працы, яркіх выступленняў і запамінальных перамог!

Настасся ЮРКЕВІЧ

ПАЛІНА ПЛОТНІКАВА:

— Кыргызстан сустрэў надзвычай цёпла. Нас уразіў горад, народ, прыём. І канкурэнты, таму што яны былі вельмі выхаваныя і добразычлівыя, што не заўсёды ўласціва такой абстаноўцы. Калі ехалі ў Бішкек, не разлічвалі на перамогу, проста хацелі годна прадставіць краіну. Конкурс быў моцны, і ён падштурхнуў нас да развіцця. Мы адзіныя паказвалі беларускі танец і выкраліся на ўсе 110 %.

СОФ’Я МАКАРАНКА:

— Дух саперніцтва адчуваўся, бо на конкурсе сабраліся лепшыя з лепшых усёй СНД. У нас было восем чалавек, а ў іншых ансамблях — вялікая колькасць танцораў. Мы хваляваліся, таму што іх харэаграфія выглядала вельмі ярка. Момант перамогі памятаю цьмяна: эмоцыі зашкальвалі. Калі выйшлі на сцэну, было радасна пачуць воклічы падтрымкі і апладысменты ад канкурэнтаў. Бо ўсе гаварылі на адной мове — танца.

Бібліятэка як музей ці як батлейка?

Найлепшыя прадстаўнікі нашай сферы былі адзначаныя да Дня работнікаў культуры. Сярод узнагароджаных — намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Вольга Камендантава. Міністр культуры Анатолій Маркевіч уручыў ёй Ганаровую грамату "За шматгадовую добрасумленную працу і значны ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнай культуры".

— Вольга Макараўна, вы 25 гадоў працуеце ў бібліятэчнай галіне. Якія пачуцці выклікала высокая ацэнка вашай дзейнасці?

— Я была вельмі рада і ўсцешана не толькі атрыманай узнагародай, але і віншаваннямі ад сваіх калег. Бо насамрэч гэтая ўзнагарода — наша з імі агульная, вынік нашай калектыўнай працы.

— Якая, на вашу думку, сёння галоўная задача бібліятэк? Прывучыць да кнігі, да чытання?

— Галоўнае — даць інфармацыю. А ўжо ў якім яна будзе выглядзе, друкаваная ці лічбавая, не так важна. У тым, што ўвесь свет рушыць да лічбавых носьбітаў, нельга не бачыць пазітыву, бо праз гэта інфармацыя становіцца яшчэ больш даступнай. І мы гэта скарыстоўваем! Так, з верасня на нашым сайце з'явіўся чарговы віртуальны праект — "Святыя заступнікі Віцебшчыны". Друкаванае выданне не мела б такой хуткасці і даступнасці распаўсюджвання. Ці тыя ж рэгіянальныя СМІ, што захоўваюцца ў нас з 1946 года. Старонкі з часам жаўцеюць, сям-там гатовыя нават рассыпацца, бо якасць газетнай паперы была не самай лепшай, а запытаў на газеты зашмат. І мы павінны алічбаваць свае фонды. Ствараем таксама камбінаваную базу дадзеных краязнаўцаў Віцебшчыны. Гэта справа няхуткая, зойме некалькі гадоў напружанай працы. Налета прадставім усе знойдзеныя матэрыялы, што тычацца дарэвалюцыйнага часу, і далей будзем рухацца ў храналагічным парадку. Не забытыя і старыя паштоўкі, якія ўяўляюць краязнаўчую цікавасць.

— І навуковую таксама! Увогуле любая навуковая дзейнасць пачынаецца з вывучэння матэрыялаў папярэдникаў — а значыць, з бібліятэчных фондаў.

— Наша бібліятэка таксама разгортвае навуковы кірунак. Так, 23 лістапада ў нас пройдзе IX Навукова-практычная канферэнцыя "Віцебскі край", якая сёлета прысвечана 85-годдзю Віцебскай вобласці. І мы ўжо абмяркоўваем наступную, дзясятую, што будзе прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Суарганізатарамі выступаюць Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Віцебскі краязнаўчы музей. Па выніках такіх канферэнцый публікуем зборнік дакладаў, выкладаем яго на сайт. Штогод на нашым сайце з'яўляецца каля дваццаці разнастайных выданняў, бо тыражы бываюць маленькімі, а цікавасць — вялікай.

— Але ж бібліятэкі цяпер займаюцца яшчэ і непасрэдным выхаваннем, робяць усё больш важкі ўнёсак у арганізацыю вольнага часу насельніцтва. І гэта не толькі сустрэчы з аўтарамі ці абмеркаванне новых твораў, але і самыя розныя віды стасункаў з наведвальнікамі, уключаючы бясплатныя курсы, майстар-класы, конкурсы, віктарыны, тэатралізаваныя імпрэзы і т.п.

— Так, сацыякультурная дзейнасць бібліятэк — патрабаванне часу. І вельмі важна, каб між рознымі бібліятэчнымі напрамкамі быў захаваны баланс, каб не было перакосу ў той ці іншы бок за кошт ігнаравання астатняга. У нас ладзяцца вечарыны, лекцыі, працуе школа камп'ютарнай пісьменнасці — зразумела, бясплатная. Аднавілі краязнаўчыя курсы, прызначаныя для ўсіх ахвочых: прыходзяць і пенсіянеры, і працоўная моладзь, старшакласнікі, ёсць і краязнаўчыя мерапрыемствы для дзяцей. Прыблізна месяц таму мы адкрылі выставачную залу ExLibris, прысвечаную рэдкім і каштоўным кнігам. Зараз думаем пра пашырэнне экспазіцыі і арганізацыю экскурсійнай дзейнасці. Асабіста я працую над сваёй аўтарскай экскурсіяй, што будзе засяроджана на факсімільных выданнях. Што ж да тэатралізаваных паказаў, дык у велікодныя дні ў нас пачаліся батлеечныя спектаклі. Пакуль у рэпертуары — усяго два найменні: велікодная пастаноўка і аповед пра Еўфрасінню Полацкую. Вядома, будзем пашыраць рэпертуар, бо такія спектаклі карыстаюцца вялікім попытам: іх любяць і зусім маленькія, і дарослыя, прычым вельмі сур'ёзныя па сваім статусе.

— А ў якасці артыстаў — няўжо вашы супрацоўнікі?

— Вядома! Дружна засвоілі лялькаваджэнне — і атрымліваем ад гэтага неймаверное задавальненне. П'есы часткова складаюцца з аўтарскага тэксту, часткова — з кампіляцыі. Увогуле батлейка — гэта калектыўная праца, і мы не парушаем традыцыі. Я пачынала прасоўваць гэтую ідэю і вельмі рада, што мае калегі яе падтрымалі і працягваюць развіваць.

— Можа, яшчэ і лялек і скрыню самі выраблялі?

— Не, у гэтым нам дапамагалі студэнты Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта: лялькі — гэта іх вучэбныя работы, выкананыя вельмі старанна і добра. Бо вынікам былі не толькі адпаведныя адзнакі ў залікоўцы, але і практычнае прымяненне.

— У вас сапраўднае менеджарскае мысленне і добрая хватка. Як трапілі на бібліятэчную ніву? З дзяцінства марылі пра гэтую прафесію?

— Ды не, неяк выпадкова склалася. Хаця ў дзяцінстве, вядома, я любіла бібліятэкі, кнігі, чытанне. Але ж адным гэтым мае схільнасці не абмяжоўваліся. У школьным узросце, да прыкладу, у мяне была вялікая цікавасць да арніталогіі, метэаралогіі. А яшчэ я вельмі захаплялася мастацтвам. Нават збіралася паступаць у Акадэмію мастацтваў, але ў той год набору на спецыяльнасць "мастацтвазнаўства" не было. І каб не марнаваць час, я паехала вучыцца ў Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя Пушкіна (цяпер гэтай навучальнай установы няма, яе далучылі да каледжа мастацтваў). І ведаеце, спадабалася! Бо бібліятэчная справа знаходзіцца недзе на сутыкненні культуры і інфармацыі. А яшчэ нагадвае музей, архіў, толькі вельмі жывы, разняволены — разнастайны. Пасля заканчэння я пяць гадоў адпрацавала ў Гомельскай абласной бібліятэцы, бо размеркавалі мяне на радзіму, у мой родны горад. І вось ужо 20 гадоў у Віцебску: пераехала туды разам з будучым мужам. Завочна скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, потым працягнула адукацыю па спецыяльнасці "менеджмент сацыякультурнай сферы". Але навошта пра мяне? Лепей пра бібліятэку! Чаго нам сёння бракуе, дык гэта рэсурсаў. Немагчыма весці навуковую працу, рабіць сур'ёзныя калекцыі толькі на сваіх матэрыялах. Мы выходзім на фонды Нацыянальнай бібліятэкі, архіваў. Наладжваем супрацоўніцтва з многімі бібліятэкамі Расіі — у прыватнасці, з Прэзідэнцкай імя Ельцына ў Санкт-Пецярбургу, Пскоўскай абласной імя Курбацкага, Смаленскай імя Твардоўскага. І такія кантакты, упэўнена, будуць пашыравацца.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Вольга Камендантава:

— 23 лістапада пройдзе IX Навукова-практычная канферэнцыя "Віцебскі край", якая сёлета прысвечана 85-годдзю нашай вобласці.

Пісана-перапісана ўжо, што творчасць развівае не толькі фантазію, кемлівасць, кругагляд, але і крытычнае мысленне. Менавіта творчасць робіць з чалавека асобу з непаўторным неабсяжным сусветам. Словам, асоба — галоўная адзінка вымярэння якаснага складу нацыі.

Пад усім, што адзначана вышэй, гатовы падпісацца Васіль Каткавец — загадчык тэатральнага аддзялення Любанскай дзіцячай школы мастацтваў, рэжысёр узорнага тэатра "Летуценнікі", адзін са стваральнікаў фестывалю "Чароўны куфэрак", які на сёння мае статус абласнога.

Узорны тэатр "Летуценнікі"

Дастаць з куфэрка мару

Любаншчына: фестывальнае закуліссе

ШЧЫРАСЦЬ ПЕРЫФЕРЫІ

Тэатр натхняе. І не мае асаблівага значэння, самадзейны ён ці прафесійны. Мне даводзілася бываць на буйных святах аматарскага тэатральнага мастацтва. Гэта вулкан жарсцей, у якім кожны — найлепшы ды ўнікальны...

Спачатку была мара. Потым Каткавец прыдумаў "Куфэрак". А перадгісторыя такая. "Летуценнікі" Васіля Сцяпанавіча займелі званне ўзорных ды скіраваліся ў Магілёў на рэспубліканскі тэатральны фэст. Там Каткавец, агаломшаны маштабам ды якасцю падзеі, вырашыў неадкладна стварыць сваё свята, рэгіянальнае, дзіцячае і не менш выразнае па падборы ўдзельнікаў.

Ідэю падтрымалі калегі ў Салігорску, Слуцку і Мінску. Так у 1987-м узнік "Чароўны куфэрак", які зрабілі ў складчыну. Цягам трох дзён на сцэне Любанскага дома культуры выступіла каля сямі дзіцячых тэатральных калектываў. Праз 10 гадоў фестываль стаў абласным. І вось тут кіраўнік "Летуценнікаў" агучыў, на мой погляд, самае галоўнае. Калі з'явілася магчымасць і прапанова надаць мерапрыемству рэспубліканскі размах, Васіль Сцяпанавіч выказаў катэгарычную нязгоду. Маўляў, перыферыйнасць — рэч не ганебная, наадварот — шчырая і камерная. Урэшце, самая чыстая вада ў той лясной крынічцы, якая знаходзіцца ў самым гушчары.

"Чароўны куфэрак" зберагае шчырую чысціню і сёння. Але любанская крынічка не хаваецца ў дрымучым лесе: да яе пратаптана надзейная сцяжына, а ў куфры любы ахвотны знойдзе сюрпрыз.

ДЗЕЯ Ў РАЗВІЦЦІ

Кожны фэст у Любані прысвечаны пэўнай асобе ці з'яве. Да прыкладу — Коласу, Купалу, беларускаму кнігадрукаванню... Асноўнай задачай праекта застаецца папулярызацыя нашай літаратуры і драматургіі. На кожным "Чароўным куфэрку" прысутнічаюць беларускія пісьменнікі, ладзяцца майстар-клясы, адмысловыя гасцёўні.

Сёлета прайшоў 14-ы фэст. На ім паказалі тэатральнае майстэрства два дзясяткі дзіцячых калектываў. Да слова, калісьці "Куфэрак" быў толькі драматычным. Сёння ён лялечна-драматычны. Мерапрыемства 2023 года прысвячалася Уладзіславу Галубку, пры дапамозе якога ў Любані створаны народны тэатр.

Васіль Каткавец умее любіць Беларусь і вучыць гэтаму высокаму мастацтву падлеткаў Любанскага краю.

Так, "Куфэрак" развіваецца: на свяце выступаюць найлепшыя тэатральныя суполкі літаральна з усіх абласцей Беларусі. На спектаклі прыходзяць не толькі падлеткі. Адпаведны рэпертуар складаецца і для іх бацькоў. Дзякуючы гэтым намаганням фэст займеў статус сямейнага. Шмат стала моладзевых праектаў. Самы апошні — "Тэатральнае бяссонне". Сапраўды, ці да сну, калі на сцэне адбываюцца неверагодныя эксперыменты. Карацей кажучы, Любань даўно ўжо горад тэатральны.

ПАЛЕТАК З ВАСІЛЬКАМІ

За Каткаўцом трэба хадзіць з нататнікам, каб запісваць прыказкі, прымаўкі, прыпавесці і байкі з жартамі. Я з Васілём Сцяпанавічам пазнаёміўся так: у наш бусік, што вандраваў па Міншчыне, заскочыў жвавы ды вясёлы мужчына, павітаўся і папрасіў: "Дазвольце прыматкабожыцца да вашай кампаніі!" Мая калекцыя цікавых слоў значна павялічылася пасля сустрэч са спадаром Каткаўцом. Я вельмі ўдзячны Богу, што знаёмы з гэтым выбітным чалавекам.

Васіль Сцяпанавіч — паляшук, нарадзіўся на Іванаўшчыне. Палешукі — беларусы асаблівыя, умеюць і рэчку слухаць, і з лесам размаўляць. Адсюль тонкае разуменне прыроды рэчаў і з'яў. Ці не з яго пачынаецца творца, артыст?

У нашай галіне спадар Каткавец працуе амаль паўвеку. Скончыў Гродзенскае культасветвучылішча, Інстытут культуры ў Мінску, завочна — філалагічнае аддзяленне сталічнага пединстытута. З 1995-га па 2018-ы ўзначальваў аддзел культуры Любанскага райвыканкама. За гэты час работнікі культуры Любаншчыны неаднаразова станавіліся найлепшымі ў Мінскай вобласці, а "Летуценнікі" не толькі займелі званне ўзорнага калектыву, але і былі адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Васіль Сцяпанавіч — цудоўны арганізатар, кіраўнік, рэжысёр. А яшчэ — артыст, удзельнік сароцкага народнага хору "Прасніца" і народнага ансамбля народнага гумару "Смехаўё" пры раённым Цэнтры культуры. А яшчэ — таленавіты літаратар, аўтар вершаў, апавяданняў, віншаванняў і сцэнарыяў. Выдаў зборнік "Васількові палетак". І самае галоўнае: Васіль Каткавец умее любіць Беларусь і вучыць гэтаму высокаму мастацтву падлеткаў Любанскага краю.

ВАНДРОЎНЫЯ АРТЫСТЫ

"Летуценнікі" цалкам апраўдваюць сваю назву: яны, лёгкія на пад'ём, аматары падарожнічаць на конях, колах, аўтамабілях, цягніках... Дзе толькі ў любанскага тэатра няма сяброў! З'явіліся яны і ў Гатчыне, горадзе ля Санкт-Пецярбурга. Рускіх і беларускіх дзяцей з'яднаў тэатр. Гатчынцы зладзілі фэст, назвалі яго "Сустрэчы". Тэатральнае сяброўства — асаблівае. Сцэна не хлусіць, яна імгненна паказвае, хто на што здатны. І менавіта сцэна становіцца надзвычай дзейсным сродкам узаемаразумення. Замежныя паплечнікі "Летуценнікаў" навучыліся вымаўляць слова "куфэрак", хутка разабраліся з яго значэннем і захацелі пераканацца ў магічных якасцях рэчы. Гатчынцы самі зрабілі яе, напоўнілі падарункамі, а пасля арганізавалі ў сваім Доме культуры квэст і агульнымі намаганнямі знайшлі "Чароўны куфэрак".

Вось вам і перыферыя!

Яўген РАГІН

Фота з архіва Васіля Каткаўца

Замчышча на Менцы: таямніцы хутка раскрыюцца

Гісторыя заснавання беларускай сталіцы мае ўсе прыкметы дэтэктыва. Драматычная завязка, шмат крыві, безліч загадак... І, як гэта заведзена ў творах сапраўдных майстроў, інтрыга не вычэрпваецца да канца. Пра тое, дзе ж гэты горад з'явіўся, адмыслоўцы спрачаюцца ўжо амаль стагоддзе. Маштабныя раскопкі, распачатыя сёлета па даручэнні беларускага Урада, мусілі нарэшце паставіць тую кропку. Каб даведацца, ці выканана амбітная місія, карэспандэнт "К" напрыканцы археалагічнага сезона выправіўся на Менку. Наўпрост ля раскопу мы гутарым з кіраўніком даследаванняў, загадчыкам аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэем Вайцяховічам.

— Раскопкі гарадзішча на Менцы ладзяцца далёка не першы раз, ды і асабіста вы гэты аб'ект вывучаеце даўно. Ці блізіцца момант, калі ўсе таямніцы будуць раскрыты?

— Ведаеце, логіка тут простая: чым больш помнік даследуецца, тым менш становіцца таямніц. Нашы сёлетнія раскопкі істотна наблізілі той момант, пра які вы кажаце. Не сумняваюся, што прыйдзе час, калі мы раскладзём усё па палічках. І ён ужо не за гарамі.

— Аднак, напэўна, так лічылі і тыя, хто вывучаў помнік у 1950-я або ў 1960-я...

— Матэрыялы папярэдніх даследаванняў ты не заўсёды да канца разумееш, бо сам побач не стаяў. Цяпер у мяне куды больш магчымасцей асэнсаваць і абагульніць даробак знакамітых археолагаў, якія працавалі на гэтым аб'екце раней. Да таго ж з'явіліся і новыя дадзеныя, якія ўносяць значныя карэктывы. Прыкладам, наш слынны папярэднік Георгій Васільевіч Штыхаў фрагменты драўляных канструкцый трактаваў як клеці, якія складалі аснову вала. Але, улічваючы невялікую плошчу раскопу, апанент даследчыка Эдуард Міхайлавіч Загарульскі вырашыў, што гэта аснова варот уязной брамы феадальнай сядзібы. Мы пашырылі раскоп да 25 метраў і выявілі: тыя зрубы — сапраўды клеці, змешчаныя ў аснове старажытнага вала.

— Але адкуль у вас упэўненасць, што таямніцы хутка раскрыюцца?

— Акурат нядаўна аддалі знойдзеныя намі сёлета ўзоры драўляных унутрывальных канструкцый на дэндралагічны і радыявуглядродны аналіз, які дазволіць устанавіць іх кладныя ўзрост. Цяпер чакаем вынікаў. Калі іх атрымаем, магчыма, нашы гіпотэзы пацвердзяцца, і тады ўсе часцінкі пазла стануць на свае месцы. Думаю, гэта здарыцца да канца года.

— Вы маеце на ўвазе тую загадку, якая хвалюе ўжо не першае пакаленне неабыякавых да мінуўшчыны беларусаў: дзе ж усё-такі зарадзіўся Мінск — на Менцы або на Свіслачы?

— Менавіта будаўніцтва валоў ды іншых абаронных канструкцый азначае з'яўленне горада. Адпаведна, той год, калі адшуканае намі дрэва спілавалі і калі з яго зрабілі зруб, можна лічыць часам заснавання Мінска. Калі аналіз засведчыць, што гэта здарылася ў канцы X — пачатку XI стагоддзя, гіпотэзу, што Менск з'явіўся на Менцы, можна лічыць даказанай.

— Галоўны ваш апанент, знаны археолаг Эдуард Загарульскі, сцвярджаў, што вал узнік у XIV стагоддзі, а ў XI веку ніякага горада на Менцы не існавала. Была сядзіба феадала або нейкае паселішча...

— Прабачце, якая феадальная сядзіба можа мець плошчу ў 30 гектараў? Гэта нават абмяркоўваць смешна. Што да вёскі...

Сельскагаспадарчыя прылады падчас раскопак нам калі і трапляліся, то вельмі рэдка. Затое мы выявілі шмат майстэрняў. Прычым прадстаўлены самыя розныя віды рамёстваў — каменя-, касцярэзнае, ювелірнае розных кшталтаў... Вяскоўцы таксама спакон веку выраблялі сваімі рукамі патрэбныя рэчы — як умелі. Але ж тут жылі сапраўдныя прафесіяналы, чый узровень часам уражвае.

Яшчэ адна прыкмета горада — сядзібы заможных людзей. Сёлета мы раскапалі дом купца, і падобная пабудова тут не адзіная.

Далей — прысутнасць узброенай дружыны... Адпаведна, матэрыяльная культура, якую мы раскрываем падчас раскопак, адназначна сведчыць, што тут раскінуўся менавіта горад.

Аднак трэба ўлічваць, што ён не з'яўляўся сталіцай княства — як, напрыклад, Полацк або той жа Менск на Свіслачы. У XI стагоддзі горад быў звычайным цэнтрам сялянскай акругі. Тут не было князя, толькі адміністрацыя, племянная знаць.

Параўнаўшы адшуканыя матэрыялы з вынікамі іншых раскопак, мы неміну ча прыйдзем да высновы, што Менск на Менцы — гэта тыповы паўднёваруskі горад. Тут няма такога балцкага ўплыву, як на крывіцкай поўначы. На яе развіццё шмат у чым паўплывала магутная транспартная артэрыя — Дзвіна. Адсюль жа да вялікіх рэк далёка.

— Яшчэ адна тэма дыскусій у даследчыкаў: Менск на Менцы быў крывіцкім — або дрыгавіцкім?

— Хутчэй за ўсё, паселішча на Менцы паўстала ў IX стагоддзі, калі сюды з поўдня прыйшлі славянскія плямёны. Гэта лука-райкавецкая культура, якая склалася на аснове пражскай — самай першай славянскай. А вось дрыгавічы сфарміраваліся пазней — толькі ў XI стагоддзі, прычым на гэтых землях. Паселішча ўзнікла раней за дрыгавічоў.

— А навошта ствараць новы горад за нейкіх 15 кіламетраў ад старога ды пераносіць яго на Свіслач?

— На маю думку, калі Глеб Усяслававіч атрымаў у спадчыну гэтую волась, ён вырашыў пабудаваць сабе новы Менск — каб не звязвацца са старым племянным цэнтрам. Пэўны час два Менскі суіснавалі. Але паступова насельніцтва перацякло на Свіслач — там княжацкі пасад, больш магчымасцей для гандлю і развіцця рамяства, лепшыя працоўныя месцы... Карацей, звычайная міграцыя, знаёмая нам і сёння. Тут, на Менцы, яшчэ сяк-так броіла жыццё, аднак ужо праз 20—30 гадоў горад прыйшоў у заняпад. Нам яшчэ трапляліся матэрыялы першых дзесяцігоддзяў XII веку. Потым — амаль нічога, хіба адзінкавыя рэчы. Пэўна, на месцы горада была маленькая вёсачка. Жыццё на гэтых валах большменш адраджаецца толькі стагоддзі праз два.

— Што вашы знаходкі сведчаць пра лад жыцця населенага пункта на Менцы? Як выглядаў "сярэднестатыстычны" мінчук?

— Ён быў рамеснікам або гандляром — як, зрэшты, і жыхар любога горада. Сёлета мы выявілі шмат розных прылад працы: долаты, стамескі і г. д. Багата імпартных рэчаў з розных рэгіёнаў, галоўным чынам з Усходу: скажам, шкляныя пацеркі і фрагменты фаянсу альбо з Самарканда, альбо з Персіі... Але знайшлі і вельмі рэдкую скандынаўскую фібулу.

— А ці была ў Менска нейкая рамесніцкая спецыялізацыя?

— Тады ў горадзе выраблялі літаральна ўсё — ад сельскагаспадарчых прылад да ювелірных упругожанняў. Неабходна было задавольваць размаітыя патрэбы сялянскага навакольля. Што да профілю... Кераміка тут вельмі якасная, і яе трапляецца шмат.

— Цікава, адкуль сюды прыходзілі сучасныя для тых гадоў тэхналогіі? Магістральных шляхоў побач няма, навокал — глухія лясы...

— Гандляры прывозілі імпартныя рэчы, а тутэйшыя рамеснікі іх капіравалі. Скажам, бралі дарагую завушніцу — і рабілі з яе адліўку (доказы таму мы не так даўно адшукалі). Усё як і цяпер, калі мясцовыя ўмельцы імітуюць "фірму".

"Гэтае месца заслугоўвае таго, каб стаць яшчэ адной візітоўкай Мінска. Нягледзячы на тое што яно знаходзіцца па-за гарадской тэрыторыяй, помнік непарыўна звязаны з гісторыяй ужо нашай сучаснай сталіцы. Мы думаем пакуль, што гэтае месца будзе філіялам Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі".

Раман Галоўчанка,
Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь

Рэшткі хаты, убудаванай у вал

Адпаведна, выпадак Менска не ўнікальны: тэхналогіі такім чынам распаўсюджваліся па ўсёй Старажытнай Русі. Так, адшуканыя намі тут ювелірныя ўпругожанні адпавядалі тагачаснай модзе.

Шкада, што не збераглася пахаванні жыхароў старадаўняга Менска — амаль усе навакольныя курганы даўно разараны. Не сумняваюся, што ў іх знайшлося б шмат цікавых рэчаў. Аднак тыя курганы, якія ўсё ж ацалелі, — самыя раннія, яшчэ X стагоддзя — паводле матэрыялу ці не найбольш багатыя сярод выяўленых у Беларусі. Гэта сведчыць пра дастатак мясцовых насельнікаў. Нам удалося даследаваць і пару разбураных пахаванняў. У іх таксама трапляюцца рэчы дарагія, не сялянскія.

— То-бок няблага людзі жылі?

— Ці вылучаўся Менск сярод аналагічных населеных пунктаў? Хіба не. Можна сказаць, што ён быў трохі багацейшым, чым, напрыклад, Друцк у тую самую пару.

— Цяпер гэта зусім несупастаўныя велічыні... Менавіта пахаванні праліваюць святло і на яшчэ адзін спрэчны аспект — рэлігійную прыналежнасць тагачасных жыхароў Менска.

— Курганы X стагоддзя — гэта калісічная язычніцкая крэмацыя. Як было далей, сказаць цяжка, бо пахаванні не ацалелі. Але на тэрыторыі горада трапляецца шмат хрысціянскай атрыбутыкі — тых жа нацельных крыжыкаў. Сёлета знайшлі частку скандынаўскага крыжыка X стагоддзя. Адпаведна, ужо ў тую пару некаторыя жыхары Менска былі хрысціянамі.

— Значыць, дзве рэлігіі нейкі час суіснавалі?

— Прычым немалы час! Адразу ж усе не сталі хрысціянамі. У гарадах прамежкавы перыяд продзіў больш хутка, у вёсцы — куды марудней. Трэба разумець, што хрысціянства набыло статус дзяржаўнай рэлігіі, таму баяры і дружына прымалі яго актыўна. Потым — купцы, заможныя майстры, а пасля — і астатнія. Думаю, тут усё адбывалася прыблізна так жа, як і на тэрыторыі Скандынавіі.

Што цікава, на гэтых землях язычніцкая традыцыя насыпання курганоў трывала аж да канца XI стагоддзя, хаця самі пахаванні ладзіліся ўжо па хрысціянскім звычаі — без крэмацыі. А з XII стагоддзя людзей пачалі аддаваць зямлі так, як і цяпер заведзена.

— Якім чынам адбывалася кіраванне горадам, як жыла супольнасць?

— Цяжка сказаць: пісьмовых звестак пра той час не засталося. Звычайна ў падобных гарадах былі прадстаўнікі адміністрацыі, якія выконвалі загады князя. Сёлета мы знайшлі яшчэ адно донца са знакам Ізяслава. Гэта сведчыць, што прадмет не патрапіў сюды выпадкова: тут іх выраблялі серыйна. Магчыма, калі Ізяслава з Рагнедай выслалі з Кіева, пэўны час яны правялі тут. Тады для іх і стварылі адмысловы посуд з родавымі знакамі. І, магчыма, менавіта тады тэрыторыя адышла да Полацкага княства, а паселішча стала горадам са сваімі ўмацаваннямі. Але гэта пакуль гіпотэза...

— Нядаўна сацсеткі абляцела вестка пра вельмі рэдкую манету, выяўленую падчас раскопак...

— Шчыра кажучы, не настолькі яна і рэдкая. Мы адшукалі ўжо тры такія дырхемы дынастыі Абасідаў. Гэта звычайная знаходка. Падобных манет тут было шмат.

— Аднак на гэтай глебе нехта нават зрабіў выснову, што Менск мог з'явіцца ўжо ў VIII стагоддзі — інакш як бы той дырхем сюды патрапіў?

— Справа ў тым, што такія манеты — а яны не мелі наміналу і выкарыстоўваліся проста як вагавое срэбра — хадзілі тут мінімум тры стагоддзі. Адпаведна, той дырхем мог і ў X, і нават на пачатку XI веку яшчэ быць у абарачэнні. Ніякіх адносін да вызначэння часу, калі заснавалі горад, такая знаходка не мае. Паўтаруся: горад у тую эпоху — гэта ў першую чаргу наяўнасць умацаванага дзядзінца.

— Ці былі сёлета археалагічныя знаходкі, якія вас здзівілі?

— Фрагменты вельмі рэдкай амфары. Унікальная рэч! Аналагаў цяпер я не ведаю.

— А яна імпартная?

— Цяжка казаць нешта пэўнае пра рэчы, якія літаральна месяц таму былі ў зямлі. Археалогія ж не толькі ў тым, каб іх адтуль дастаць. Гэта яшчэ і вельмі няпростая праца па атрыбуцыі, аналізе артэфактаў. Апісаць іх куды больш складана, чым выкапаць. А знаходак настолькі шмат, што трэба яшчэ цэлы год іх класіфікаваць.

— Сезон раскопак заканчваецца. Ці працягнуцца даследаванні ў наступным годзе?

— Так, сёлета мы зрабілі поўную прарэзку вала на вялікім гарадзішчы, а ў наступным сезоне плануем яе на малым. Што яна з сябе ўяўляе? Бярэцца нейкі фрагмент вала і раскопваецца ад верху да нізу. На тэрыторыі Беларусі прарэзак такіх маштабаў яшчэ не праводзілася. Гэта выдатная магчымасць дасканала вывучыць канструкцыйныя асаблівасці вала — і, вядома, дакладна зразумець, калі яго насыпалі. А калі наступныя раскопкі скончацца, плануецца музеефікацыя археалагічнага комплексу.

Фрагмент старадаўняй амфары

— Як паказваць турыстам археалагічныя помнікі?

— У дадзеным выпадку гэта вельмі няпроста. У тым жа "Бярэсці" добра захавалася дрэва, таму ўдалося музеефікаваць рэшткі забудовы старажытнарускага горада. Тут жа глеба такая, што і дрэва, і іншая арганіка — скажам, косткі або скура — вельмі хутка парахнеюць. Аднак ніжняя частка вала насыпана з вільготнага глею, які бралі з Менкі, і ён стаў своеасаблівым кансервантам. Калі будзем капаць далей, мабыць, выйдзем на больш-менш трывалыя зрубы. І тады нейкі ўчастак можна будзе закансерваваць ды музеефікаваць прыблізна па тым самым прынцыпе, што і ў "Бярэсці". У кожным разе без рэканструкцыі не абысцися.

— Але да стварэння сучасных рэплік сярэднявечнай забудовы некаторыя спецыялісты ставяцца... не без скепсісу.

— Лічу, гэта добры спосаб данесці інфармацыю да як мага больш шырокага кола наведвальнікаў. Чаму б не ўзяць за ўзор сінхронныя помнікі з іншых гарадоў ды не рэканструяваць, напрыклад, тыповы двор старадаўняга Менска?

— Ці варта ў музеі адлюстроўваць і пазнейшыя перыяды гісторыі гэтага месца — або мэтазгодна засяродзіцца толькі на раннім Сярэднявеччы?

— Безумоўна, варта: усё гэта наша мінулае. Натуральна, асноўны акцэнт належыць зрабіць на старажытнарускім перыядзе, але мы выявілі тут вельмі шмат цікавых матэрыялаў, што маюць дачыненне да пазнейшых часавых пластоў. Скажам, адкапалі хаціну XVII стагоддзя, якая была літаральна ўбудавана ў вал. Многа вякоў таму дом згарэў. Гаспадары не сталі яго аднаўляць, а проста засыпалі — разам з падлогай, інвентаром, рэшткамі мэблі. Фактычна закансервавалі — нібы спецыяльна для нас. Зверху зрабілі сметнік — а гэта таксама Клондайк для археолага. Там настолькі шмат цікавых матэрыялаў, што на адным гэтым раскопе можна збудаваць асобную экспазіцыю. Таму тут усё трэба паказваць, усе пласты.

Вельмі правільна, што Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ініцыяваў даследаванні і музеефікацыю гэтага комплексу. Помніка такога ўзроўню побач з Мінскам няма, і нават цяпер, калі яшчэ ідуць раскопкі, сюды прыязджае шмат турыстаў, часта цэлымі сем'ямі. Некалькі разоў на тыдзень бываюць школьныя экскурсіі.

— І гэта прытым, што, апрача незвычайнага ландшафту, тут пакуль нічога асабліва і не пабачыш, ды і ніякай інфраструктуры няма!

— Уявіце, наколькі запатрабаванай стане мясціна, калі з'явіцца музей! Ён дасць унікальную магчымасць адлюстраваць нашу гісторыю ў перыяд ранняй дзяржаўнасці.

Ілья СВІРЫН

Музейная афіша з 20 па 27 кастрычніка

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Акцыя **"У музей усёй сям'ёй"**, прымеркаваная да Тыдня бацькоўскай любові. **Да 21 кастрычніка.**
- Экспазіцыя **"Жыццё ў мініяцюры".** Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24. **Да 19 лістапада.**
- Выстава **"Уладзімір Стэльмашонак. Сыны зямлі беларускай"** з фондаў музея, прымеркаваная да 95-годдзя з дня нараджэння народнага мастака БССР, педагога Уладзіміра Іванавіча Стэльмашонка (1928–2013). **Да 20 лістапада.**
- Выстава **"Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм"** у рамках штогадовай акцыі "Вераснёвая ночы", прымеркаванай да Дня горада Мінска. **Да 11 снежня.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Віды і жанры ў выяўленным мастацтве" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўніх мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.** УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава мастака-інфэстратара Кацярыны Бабок **"Вернемся ў дзяцінства". Да 27 кастрычніка.**
- Выстава валагодскіх карункаў **"Валагодчына карункавая"** з калекцыі Валагодскага дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка. **З 26 кастрычніка да 1 лістапада.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенціна Ваньковіча".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
спартакомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Праграма **"Калядны ў музеі". Праводзіцца заўсёды.** Працяглась – 2–2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы. УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ
г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаздымкаў беларускіх творцаў XX–XXI стст. з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь **"Калі мы былі дзецьмі". Да 2 снежня.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце artmuseum.by. УНП 100377771

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь
аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819.**
УНП 190545464

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44,
тэл.: 8 017 3859751 (каса),
8 029 1540444 (замова квіткоў)

• Містычная трагікамедыя **"Махляры" (16+).** Прэм'ера. **20 кастрычніка ў 19.00.**
• Гісторыя аднаго дома **"Карней" (16+).** Прэм'ера. **21 кастрычніка ў 19.00.**
• Некамедыя **"Паляванне на сябе" (18+). 22 кастрычніка ў 19.00.**
• Песня ў 1 дзеі **"Шлюб з ветрам" (16+). 24 кастрычніка ў 19.00.**
• Тэатралізаванае чытанне п'есы **"Я, бабуся, Іліко і Ларывон" (12+). 26 кастрычніка ў 19.00.**
• Трагіфарс у 2 дзеях **"Вар'ятка" (18+). 27 кастрычніка ў 19.00.**

УНП 100220213

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Прадстаўленне **"Музыка душы" (0+).** Камінная зала. **24 кастрычніка ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Чакана гучна і да болю блізка" (16+).** Камерная сцэна. **24 кастрычніка ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+).** Галоўная сцэна. **25 кастрычніка ў 19.00.**
• Спектакль **"Як Аленка ведзьму перамагла" (6+).** Галоўная сцэна. **26 кастрычніка ў 14.00.**
• Музычна-пластычная фантазія **"Скрыжаванне" (12+).** Камінная зала. **26 кастрычніка ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"Музыка душы. Роднае" (0+).** Прэм'ера. Камінная зала. **27 кастрычніка ў 19.00.**
• Трагіфарс **Donna sola ("Жанчына адна") (18+).** Камерная сцэна. **27 кастрычніка ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Балет у 2 дзеях **"Лебядзінае возера" (12+).** Да 50-годдзя творчай дзейнасці народнага артыста Беларусі і СССР Валянціна Елізар'ева. **20 кастрычніка ў 19.00.**
• Опера ў 3 дзеях **"Піковая дама" (12+). 21 кастрычніка ў 18.00.**
• Балет у 3 дзеях **"Дон Кіхот" (12+).** Прэм'ера. Да 50-годдзя творчай дзейнасці народнага артыста Беларусі і СССР Валянціна Елізар'ева. **22 кастрычніка ў 18.00, 25 кастрычніка ў 19.00.**
• Канцэрт **"Песні вялікай краіны" (12+).** Вечары з "Серэнадай". Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **22 кастрычніка ў 18.30.**
• Опера ў 2 дзеях **"Дзікае паляванне караля Стаха" (12+). 24 кастрычніка ў 19.00.**
• Вакальна-харэаграфічнае прадстаўленне ў 1 дзеі **"Карміна Бурана" (12+).** Да 50-годдзя творчай дзейнасці народнага артыста Беларусі і СССР Валянціна Елізар'ева. **27 кастрычніка ў 19.00.**
• Балет у 1 дзеі **"Кармэн-сюіта" (12+). 27 кастрычніка ў 19.05.**
• Опера-буфа ў 2 дзеях **"Любоўны напой" (12+). 28 кастрычніка ў 18.00.**

УНП 191081322

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Кранальная гісторыя без слоў у 1 дзеі **"Дзюймовачка" (3+). 21 кастрычніка ў 11.00.**
• Казка-гульня ў 2 дзеях **"Бука" (3+). 22 кастрычніка ў 11.00.**

УНП 300001869

Вялікі тэатр Беларусі

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад у трупе аркестра:
— вядучы майстар сцэны ў групе першых скрыпак,
— артыст аркестра ў групе валторнаў.

Дадатковая інфармацыя — на сайце **bolshoibelarus.by.**

220029, г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.

УНП 191081322

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: vitebsk-fil.by

• **"ВЕЧАРОВЫЯ ГАРМОНІІ" (6+)** — сусветная класіка на фартэпіяна і вібрафоне. **24 кастрычніка ў 19.00.**
• **"ПЕСНІ АД СЭРЦА ДА СЭРЦА" (6+)** — вакальная група і аркестр ансамбля "Талака". **25 кастрычніка ў 19.00.**
• Новая імпрэза цыкла лекцый-канцэртаў **AD LIBITUM**, прысвечаная **МАРЫНЕ ЦВЯТАЕВАЙ (6+). 26 кастрычніка ў 19.00.**
• Арганны канцэрт **"МУЗЫЧНЫЯ КАЛЕКЦЫІ" (6+). 27 кастрычніка ў 19.00.**
• Да Года міру і стварэння — прадстаўленне **"ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ". 28 кастрычніка ў 11.00.**
• **"ВЕЧАР У СТЫЛІ РЭТРА" (6+)** — хіты 1980—1990-х у выкананні артыстаў філармоніі. **28 кастрычніка ў 19.00.**

УНП 300149385

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль

• Экспазіцыя **"Летапіс праса: разгладзім старонкі"** з прыватнай калекцыі Барыса Васільева і Юліі Ржэўскай. Малая выставачная зала. **Да 12 лістапада.**
• Выстава **"Упершыню экспанат. З фонду Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»"**, прысвечаная 30-годдзю ўстановы і 800-годдзю горада Нясвіжа. Вялікая выставачная зала. **Да 9 студзеня 2024 года.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара".** У складзе пастаяннай экспазіцыі.

Мерапрыемствы

• II Навуковая канферэнцыя **"Нясвіжскі замак: падзеі, асобы, спадчына"**, прысвечаная 440-й гадавіне пачатку будаўніцтва мураванага замка ў Нясвіжы. **20 кастрычніка.**
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры", "Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа", "Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)

• Выстава работ сучаснага мастака Віктара Варанкевіча **"Мінулае застаецца". Да 30 кастрычніка.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)

Пастаянныя экспазіцыі

• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу".** З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы

• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

ГЛАВНОЕ МУЗЫКАЛЬНОЕ СОБЫТИЕ ГОДА
Песня года 2023

10 декабря 2023 года, 18.00, МКСК "Минск-арена".
Стоимость билетов — от 80 до 479 руб.
Билеты можно приобрести в кассах Дворца Республики **(тел. 8 017 2299039, факс 8 017 2299285)** и на сайтах: **ticketpro.by, kvitki.by.**
Дополнительная информация по тел. 8 017 2299163.

УНП 101361712

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Запрашаем на **Тыдзень бацькоўскай любові**, у рамках якога будзе прадстаўлена інтэрактыўная зона "Сямейнае дрэва" і пройдуць майстар-класы па стварэнні тэматычных паштовак "Букет для маці" і "Мой тата найлепшы". **З 14 па 21 кастрычніка.**
• Часовая экспазіцыя **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі (23 верасня 1943 г.).
• Запрашаем юных наведвальнікаў у прастору **"Музей для дзяцей"** — гэта ўтульная атмасфера партызанскага лесу ў спалучэнні з сучаснымі тэхналогіямі, добрымі і ўважлівымі музейнымі педагогамі. Тут праходзяць заняткі і лекцыі, майстар-класы і інтэрактыўныя праграмы для хлопчыкаў і дзяўчынак і іх бацькоў. **Прастора працуе з серады па нядзелю!**
• **Квэсты** — гэта ўнікальнае пазнавальнае і захапляльнае падарожжа па музейных залах для арганізаваных груп наведвальнікаў (да 20 чалавек). Падчас квэстаў удзельнікі пашыраюць веды па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выконваюць заданні і пераадольваюць розныя перашкоды. Усяго прапануецца тры квэсты:
— **"Шлях да Перамогі"**, узрост удзельнікаў — ад 12 гадоў.
— **"Сумка з чырвоным крыжам"**, узрост удзельнікаў — ад 14 гадоў.
— **"Франтавы дзённік"**, узрост удзельнікаў — да 12 гадоў.

Падрабязнасці на сайце warmuseum.by.

УНП 100235472

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Квэст **"Белы слон". 21 кастрычніка ў 15.30.**
• Выстава **"ARMATUS. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі" (0+).** Паўночны корпус. **Да 28 кастрычніка.**
• Часовая экспазіцыя васковых фігур **"Тайная вячэра" (0+). Да 10 снежня.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Квэст-экскурсія для ўсёй сям'і **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Курс **"Арт-азбука ў НЦСМ" (8+). З 21 кастрычніка 2023 года па 31 мая 2024 года.** Кожная сустрэча складаецца з тэарэтычнай часткі і творчых заняткаў. Яны будуць праходзіць у інтэрактыўнай форме, удзельнікаў чакаюць практычныя заданні, майстар-класы, квэсты і гутаркі з мастакамі. Праграма курса пабудавана на работах, якія захоўваюцца ў фондзе НЦСМ, сучасных беларускіх аўтараў.
Працягласць аднаго занятку — 2 гадзіны. Колькасць удзельнікаў у групе — 10—12 чалавек. Перыядычнасць заняткаў — 2 разы на месяц па суботах. Кошт аднаго занятку — 15 рублёў. Абавязковая папярэдняя рэгістрацыя!
Дадатковая інфармацыя і запіс на курс па тэл.: 8 017 2350331, 8 017 3629336 (9.00—17.00).

УНП 192543414

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАУРЫШ, Яўген РАГІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ільля СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактар літаратурны — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Рэдактары мастацкія — Мікалай КАСЦЮКОЎ, Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 19.10.2023 у 16.00. Замова № 2349. Наклад 3451.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2023.